Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
29 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 121 (28988)

## СВЯТА МАЛАДЫХ

Дарагія юнакі і дзяўчаты!

Ад усяго сэрца віншую з Днём моладзі.

Гэта свята самай ініцыятыўнай, таленавітай і мэтанакіраванай часткі грамадства, яркімі здзяйсненнямі якой ганарыцца і захапляецца ўся Беларусь.

Значныя адукацыйныя і навуковыя праекты, паспяховыя стартапы, спартыўныя медалі, перамогі на творчых конкурсах пастаянна пацвярджаюць, што вы знаходзіцеся на правільным шляху. А ў краіне робіцца ўсё магчымае, каб у жыццё ўвасабляліся вашы самыя смелыя мары.

Вам пашчасцілася нарадзіцца і вырасці ў суверэннай дзяржаве, пабудаванай на трывалым фундаменце шматвяковай гісторыі беларускага народа.

Яго гераізм падчас Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца асаблівай старонкай гэтага летапісу. Праз некалькі дзён мы адзначым знакавую дату — 75-годдзе вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў. У гады ліхалецця вашы равеснікі змагаліся за Радзіму з неверагоднай мужнасцю, самаадданасцю і патрыятызмам. Іх унёсак у агульную перамогу над фашызмам сапраўды велізарны.

Вы дастойныя нашчадкі і прадаўжальнікі слаўных традыцый гераічнага пакалення. У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу, нават пад мірным небам.

Перакананы, сваімі новымі дасягненнямі вы яшчэ не раз здзівіце сучаснікаў і назаўсёды ўвойдзеце ў гісторыю роднай краіны.

Жадаю вам невычэрпнай энергіі, упэўненасці ў сваіх сілах і ўдачы ва ўсіх пачынаннях.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Адміністрацыя сёння практыкуе ўсе магчымыя метады і формы маніторынгу сітуацыі на месцах, і ні адна тэма, якая хвалюе грамадзян, не застаецца па-за ўвагай. Вышэйшыя службовыя асобы, у тым ліку кіраўнік Адміністрацыі асабіста, наведваюць пасяджэнні выканкамаў, дзе мясцовым органам улады давodзяць даручэнні кіраўніка дзяржавы, перш за ўсё накіраваныя на павышэнне дабрабыту грамадзян і актывізацыю работы вертыкалі з насельніцтвам».*



Фота БелТА.

# КАЛІ КВІТНЕЮЦЬ САДЫ СЯБРОЎСТВА

### Прэзідэнты Беларусі і Таджыкістана абмеркавалі пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння

**Аспекты супрацоўніцтва дзвюх краін у выглядзе дарожнай карты да 2020 года былі вызначаны ў маі 2018-га падчас афіцыйнага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Таджыкістан. Спектр эканамічных сувязяў досыць шырокі — ад цяжкай прамысловасці да сельскай гаспадаркі. Працуе ў Гісары запушчаны больш за год таму ў прысутнасці прэзідэнтаў сумесны трактарны завод «Агратэхсэрвіс». У паўднёвых раёнах Беларусі растуць сады, закладзеныя з саджанцаў, якія прывезлі з Таджыкістана. База для візіту прэзідэнта Эмамалі Рахмона ў Беларусь выдатная, але ёсць у лідараў і актуальныя пытанні для абмеркавання — гандаль, пашырэнне кааперацыі, развіццё партнёрства ў навукова-тэхнічнай сферы. Гэтыя тэмы сталі асноўнымі падчас перагавораў у Палацы Незалежнасці.**

СТАР. 2

# «ПАЛЯЎНІЧЫ ТУШ» ДЛЯ ПЕРАМОЖЦАЎ

Незвычайны глядач з'явіўся на II Еўрапейскіх гульнях у Мінску: на рукаве яго адмысловай адзежы — нашыўка герба горада Драгічына, у руках — самы сапраўдны паляўнічы рог. Гэта Мікалай ШАЎЧУК — заснавальнік і кіраўнік гурта паляўнічай музыкі «Бакас», удзельнік рэспубліканскіх і міжнародных выставак і фестываляў на паляўнічую тэматыку. Ён прыехаў з палескага горада, каб падтрымаць дух беларускіх асілкаў, якія выступаюць за нашу краіну на барцоўскіх дыванах у мінскім Палацы спорту. На сваім музычным інструменце Мікалай гучна выводзіць бадзёры марш «Кароль палявання» , «Паляўнічым тушам» агалошвае гульнявую прастору. Чаму менавіта сюды і чаму гэты від спорту — барацьбу — выбраў паляшук? Адказ яго цікавы: сорак пяць гадоў таму Мікалай Шаўчук скончыў Мінскі інстытут фізкультуры (так называўся раней універсітэт фізічнай культуры) па спецыяльнасці вольная барацьба, працяглы час быў трэнерам у раённай спартшколе, болей за дзесяць гадоў быў настаўнікам фізкультуры ў вясковай школе. Наведваннем Еўрапейскіх гульняў Мікалай Аляксандравіч сведчыць, што стыхія вольнай барацьбы па-ранейшаму жыве ў яго нераўнадушнай да спорту душы. Музыкант прыехаў у сталіцу, каб сустрэцца з былымі студэнтамі-аднагрупнікамі, якія таксама жывуць Гульнямі і прыходзяць на паядынкі падтрымаць нашых.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**




# Законы эфектыўнага развіцця

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М. У. Мясніковіча на закрыцці шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

У перыяд шостай сесіі Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання ажыццяўляў дзейнасць па рэалізацыі пастаўленых кіраўніком дзяржавы задач, заканадаўча забяспечваючы ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё. Прынята да ведама тры дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адобрана 58 законапраектаў, у тым ліку 36 аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў.

Завершана работа над законапраектам «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах», распрацоўку якога ажыццявіў Савет Рэспублікі.

Прынята новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса.

СТАР. 3

# Фактары ўстойлівага росту

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на закрыцці шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя дэпутаты і запрошаныя!

Шостая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання завяршае сваю работу.

Яе парадак быў сфарміраваны з улікам задач па выкананні пяцігадовай Праграмы развіцця краіны і ўстановак кіраўніка дзяржавы, адрасаваных дэпутацкаму корпусу ў яго Пасланні беларускаму народу і парламенту.

Падчас сесіі намі разгледжана 90 дакументаў. Асноўная ўвага была ўдзелена рэалізацыі новых падыходаў да кіравання эканомікай, развіццю дзелавой ініцыятывы, лібералізацыі гаспадарчай дзейнасці, выкарыстанню прававых інструментаў еўразійскай інтэграцыі ў інтарэсах нацыянальнай эканомікі.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X
19121>
9 771990 763008

# КАЛІ КВІТНЕЮЦЬ САДЫ СЯБРОЎСТВА

## «Сумаваць не дадзім»

Як звычайна прынята, афіцыйны візіт лідара замежнай краіны пачаўся размовай у вузкім складзе. Аляксандр Лукашэнка нагадаў: сустрэча адбываецца падчас значнай падзеі — II Еўрапейскіх гульняў, якія прыцягнулі ў Мінск тысячы замежных гасцей. Прэзідэнт акцэнтаваў увагу: «Яны ў большасці сваёй адкрываюць Беларусь для сябе, здзіўляюцца, што ў іх былі іншыя ўяўленні».

Падчас візіту Эмамалі Рахмона бакі падкарэктуюць дарожную карту адносін у плане інтэнсіфікацыі, абмяркуюць супрацоўніцтва Беларусі і Таджыкістана з трэцімі краінамі, асабліва з Афганістанам. Асаблівая ўвага — аграрным праектам.

«Гэта не проста знак — закладка двух садоў у Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Гэта спроба нам знайсці новыя культуры для вытворчасці тавараў сельскагаспадарчага назначэння ў Беларусі, тых, якія мы раней не стваралі. Аналагічным шляхам мы спрабуем супрацоўнічаць з Узбекістанам. Там бахчавыя культуры. Іх спецыялісты, таксама як і вашы, прыязджалі сюды. Сёе-тое мы ўжо высадзілі. Сёлета атрымалі вельмі высокую ацэнку спецыялістаў з Узбекістана. А таджыкскія спецыялісты даўно тут працуюць разам з намі і прасоўваюць гэты кірунак», — расказаў кіраўнік краіны.

Такое супрацоўніцтва дапамагае аграрыям здзейсніць задачу, пастаўленую Аляксандрам Лукашэнкам, па выхадзе на новыя віды прадукцыі, якія раней не вырошчваліся ў Беларусі, але з-за змянення клімату актуальныя і для нас.

У наступныя дні перагаворы зменяць двухбаковы фармат — да іх далучыцца прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. У расшыраным складзе кіраўнікі краін абмяркуюць пытанні з парадку дня СНД, АДКБ. А ўвечары ў нядзелю лідары трох краін наведаюць цырымонію закрыцця Еўрапейскіх гульняў.

## Сімвалы сяброўства

Штогадовыя сустрэчы лідараў, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка на перагаворах у пашыраным складзе, становяцца добрай традыцыяй.

«Сёння падчас сустрэчы з Эмамалі Шарыпавічам мы яшчэ раз пераканаліся ў падабенстве падыходаў да ацэнкі глабальнай і рэгіянальнай сітуацыі. Мінск і Душанбэ традыцыйна аказваюць адзін аднаму ўзаемную падтрымку на міжнародных пляцоўках. Я перакананы, так будзе і надалей», — сказаў беларускі Прэзідэнт.

Вынікам візіту стала падпісанне Дагавора аб стратэгічным партнёрстве. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, дакумент з'яўляецца заканамерным вынікам выбудоўвання дружалюбных і пасапраўднаму канструктыўных адносін, а яго ўвасабленне ў жыццё надасць дынаміку далейшай рабоце па ўсіх кірунках.

«Паміж нашымі краінамі няма закрытых тэм для супрацоўніцтва, з Прэзідэнтам у нас поўнае паразуменне. Калі мы дамовіліся, усё выконваецца ў тэрмін», — адзначыў лідар нашай краіны.

## Паставіць супрацоўніцтва на рэйкі

«Беларусь настроена на сістэмную і доўгатэрміновую работу ў эканамічнай сферы. Тавараабарот пад 40 мільёнаў долараў, які дасягнуты па выніках мінулага года, абсалютна не адпавядае нашаму ўзаемнаму патэнцыялу. Пра гэта мы, дарэчы, з Эмамалі Шарыпавічам толькі што размаўлялі. Спадзяёмся, што тэндэнцыя падзення аб'ёмаў гандлю носіць часовы характар. І трэба не проста спадзявацца, яе трэба выправіць, а яе члены дэлегацый, якія прысутнічаюць тут, абавязаны выправіць», — падкрэслівае Прэзідэнт Беларусі.

Асноўа для супрацоўніцтва ў галіне прамысловай кааперацыі — падабенства пагляда ў на развіццё рэальнага сектара эканомікі. Ужо другі год працуе сумесная зборачная вытворчасць у горадзе Гісары. Краіны гатовыя да пашырэння наменклатуры выпускаемай тэхнікі, адаптаванай пад патрэбы аграрнай галіны Таджыкістана. Садзейнічаць гэтаму будзе і вызваленне такой прадукцыі ад падатку на дабаўленую вартасць.

Жыхары Душанбэ ўжо ацанілі беларускія тралейбусы. Далейшая перспектыва — пастаўка грузавых аўтамабіляў, дарожнабудаўнічай, пасажырскай тэхнікі, абнаўленне парку чыгуначных вагонаў, адпаведных таджыкскім кліматычным і эксплуатацыйным умовам.

«У цяперашні час крызісныя з'явы ў свеце ўносяць карэктывы ў развіццё эканамічных адносін. Таму важна шукаць новыя формы і метады работы, у тым ліку з улікам наяўных у Беларусі інструментаў падтрымкі экспарту. Паралельна з праектамі ў машынабудаванні неабходна нашыраць дыялог у сферы сельскай гаспадаркі, уключаючы аграрную адукацыю. Працаваць над павелічэннем узаемных закупак прадуктаў харчавання і прадукцыі лёгкай прамысловасці, развіваць супрацоўніцтва ў галіне племянной жывёлагадоўлі», — прапаноўвае кіраўнік Аляксандр Лукашэнка.

Пачала работу ў Душанбэ сумесная кампанія па вытворчасці малочных прадуктаў. Беларускі вопыт, тэхналогіі і сыравіна дазваляюць стварыць унікальныя для Таджыкістана прадпрыемствы. Яны не толькі будуць выпускаць экалагічную і якасную прадукцыю, але і адкрыюць магчымасці для нарошчвання экспарту ў Кітай, Афганістан, іншыя краіны.

## Народная дыпламатыя

Дынамічна развіваюцца адносіны ў гуманітарнай сферы. У цяперашні час у беларускіх ВНУ вучыцца больш за пяцьсот таджыкскіх грамадзян. Дзякуючы стварэнню пяці сумесных факультэтаў сёння можна атрымаць якасную і сучасную беларускую адукацыю на таджыкскай зямлі. Гатовы беларусы таксама абменьвацца вопытам прафесійна-тэхнічнай падрыхтоўкі кадраў і стварэння сеткі неабходных цэнтраў, аказаць кансультацыйныя паслугі ў сферы развіцця адукацыйных праграм. Чакаюць таджыкскіх майстроў культуры і мастацтва ў Беларусі ў рамках дзён культуры.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, падпісаныя па выніках сустрэчы двухбаковыя дагаворы і праграмы нададуць імпульс для актывізацыі міжведамаснага, рэгіянальнага і дзелавога супрацоўніцтва і адкрыюць магчымасці пашырыць узаемадзеянне ў галіне інфармацыі, інавацый, спорту, турызму і па іншых кірунках.

Акрамя Дагавора аб стратэгічным партнёрстве, падпісана больш за дзясятак дакументаў.

## «Выхад у космас»

Падчас заявы для прэсы Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Таджыкістан зарэкамендаваў сябе як верны сябар і важны партнёр Беларусі. Гэта стала магчыма ў тым ліку дзякуючы традыцыйна высокай ступені даверу ў дыялогу на ўсіх узроўнях.

Расказаў Аляксандр Лукашэнка пра змест падпісанага Дагавора аб стратэгічным партнёрстве паміж нашымі краінамі: «Гэта «выхад у космас», калі хочаце, у адносінах паміж дзвюма дзяржавамі. У ім мы замацавалі якасна новы статус двухбаковых адносін. І пацвердзілі намер актыўна развіваць іх ва ўсіх абласцях, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Гэта — заканамерны вынік вялікага шляху, які прайшлі Беларусь і Таджыкістан у выбудоўванні міждзяржаўных сувязяў».

У сваю чаргу прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон павіншаваў краіну з выдатным правядзеннем спаборніцтваў Еўрапейскіх гульняў і звярнуў увагу на важнасць пашырэння рэгіянальных сувязяў.

Эмамалі Рахмон расказаў, што абмеркаваў з Аляксандрам Лукашэнкам праблему забеспячэння бяспекі: «Мы пацвердзілі ўзаемную цікавасць працягвання ўзаемадзеяння кампетэнтных органаў бакоў у барацьбе з глабальнымі пагрозамі і выклікамі, тэрарызмам, экстрэмізмам і транснацыянальнай арганізаванай злачыннасцю, уключаючы наркатрафік. Мы абмеркавалі афганскую праблематыку, па якой нашы краіны зыходзяць з агульных пазіцый. Мы выказаліся за далейшыя сумесныя намаганні па садзейнічанні аднаўленню міру і стабільнасці ў Афганістане ва ўсіх фарматах».

Краіны будуць узмацняць узаемадзеянне ў рамках і міжнародных арганізацый — ААН, СНД, АДКБ, ШАС.

**Марыя ДАДАЛКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЗААХВОЧВАННІ ДА СВЯТА

**Напярэдадні Дня эканаміста прадстаўнікоў БДЭУ запрасілі наведаць Палац Незалежнасці — так вырашылі заахвоціць найлепшых з найлепшых у гэтай прафесіі. Спецыялістам эканамічнай навукі паказалі тыя самыя залы, дзе праходзілі сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з кіраўнікамі дзяржаў, буйныя міжнародныя мерапрыемствы; падрабязна расказалі ім пра творы мастацтва, якія былі падораны беларускаму лідару. Увогуле, дапусціці да святая святых — дык якія ўражанні склаліся ва ўдзельнікаў экскурсіі?**

Як расказаў журналістам **рэктар БДЭУ Вячаслаў ШУЦІЛІН,** прадстаўнікам яго універсітэта аказаны вялікі гонар — трапіць у Палац Незалежнасці. «На свае вочы ўбачыць усе экспанаты, што тут прадстаўлены, дакрануцца да іх, а таксама да палітычнага жыцця краіны, — сказаў ён. — Усе знаходзяцца пад велізарным уражаннем, эмоцыі зашкальваюць — і іх складана перадаць словамі».

Рэктар звярнуў увагу, што палітыку немагчыма аддзяліць ад эканомікі, таму для паспяховага існавання краіны неабходна пашыраць кола гандлёвых партнёраў па ўсім свеце. Аднак пры гэтым нельга забываць пра ўласную базу — а гэта вытворчасць тавараў і паслуг.

Ён дадаў, што менавіта ў залах Палаца адбываюцца сустрэчы і нарады, якія непасрэдна ўплываюць на жыццё краіны (вядома, гэта і эканоміка таксама).

«Хочацца павіншаваць з гэтым святам усіх, хто мае дачыненне да эканамічнай навукі і практыкі. У першую чаргу хочацца павіншаваць прафесіяналаў сваёй справы, пажадаць здароўя, поспехаў, здзяйсненняў на карысць нашай роднай краіны», — адзначыў Вячаслаў Шуцілін.

Дарэчы, ён асабліва падзякаваў Уладзіміру Шымаву, былому рэктару БДЭУ, па ініцыятыве якога гэта свята і адбылося ў Беларусі.

**Дэкан факультэта міжнародных бізнес-камунікацый Міхаіл МІШКЕВІЧ** звярнуў увагу, што Палац адлюстроўвае беларускі народ — прыгожы, без залішняй пышнасці вонкава, але з багатай душой.

«Я ўбачыў, што тут усё вельмі стыльна, вельмі вытрымана. Мне чамусьці прыгадаліся добрыя палацы — ясна, што гэта не Версальскі палац, гэта сучасны будынак. Але мяне вельмі радуе, што тут укладзена наша праца, нашых суайчыннікаў-беларусаў. Як я зразумеў, асноўныя матэрыялы тут — беларускай вытворчасці», — адзначыў ён.

Наконт экскурсіі спецыяліст сказаў, што гэта вельмі добры падарунак да Дня эканаміста: але такое не павінна быць чымсьці выключным і ўнікальным. «Мне здаецца, мы павінны ведаць, дзе працуе кіраўнік дзяржавы, дзе адбываюцца прыёмы. Адна справа, калі ты глядзіш гэта па тэлевізары, а калі тут знаходзішся, то ўражанне ўжо іншае», — адзначыў ён.

Міхаіл Мішкевіч дадаў, пачуццё датычнасці — асаблівае і прыемнае.

Салідарная з ім і **Марына КАМАРОВА, загадчыца кафедры раманскіх моў:** на яе думку, адна справа назіраць убранне Палаца па тэлевізары, а іншае — самой прысутнічаць у ім.

«Ужывую выглядае зусім па-іншаму. Уражвае размах, уражвае веліч-насць, якая тут пануе. Пачуцці зусім нечаканыя — акрыляе, хочацца тварыць», — сказала яна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Парламенцкі дзённік

# АМНІСТЫЯ — БУДЗЕ

**Адпаведны законапраект у сувязі з 75-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прынялі ў двух чытаннях дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання на чарговым пасяджэнні шостай сесіі.**

«Адрозненне ад амністыі 2015 года ў тым, што мы ўключылі сюды артыкул 328 Крымінальнага кодэкса — першую, другую і трэцюю часткі. Тэрмін скарачаецца на год, непаўналетнім будзе зніжаны на два. Пад амністыю трапляюць тыя, хто цалкам пакрыў страту ад злачынства і станоўча характарызуецца па месцы адбывання пакарання», — растлумачыў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Васіль ЧЭКАН.**

**Міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ,** які прадстаўляў законапраект, паведаміў, што з папраўчых устаноў закрытага тыпу мяркуецца вызваліць каля шасці тысяч чалавек.

Ён адзначыў, што тых, хто здзейсніў карупцыйныя злачынствы, амністыя не закране. Вызваленне ад пакарання ўвойдзе ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання Закона і працягнецца дзевяць месяцаў, а не шэсць, як мінулая амністыя.

# ПАЧЫМ ГАЗ?

**Да 2025 года кошт газу ў Беларусі і Смаленскай вобласці павінен адрозніваецца на 5 %. Пра гэта паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ЛЯШЭНКА на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, падчас якога члены ўрада традыцыйна адказалі на пытанні дэпутатаў і сенатараў.**

«Беларускі бок прапанаваў Расіі сцэнарый па частцы нашага бачання фарміравання цаны газу. Да 2025 прадугледжана пяціпрацэнтная розніца кошту газа да ўзроўню найбліжэйшай да нас Смаленскай вобласці Расіі. Мяркуецца раўнамернае паступовае збліжэнне цаны газу. Гэта прапанова зараз разглядаецца», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

У сваім дакладзе парламенту Ігар Ляшэнка адзначыў, што ў сувязі з уводзенем атамнай электрастанцыі адбываецца паэтапная рэканструкцыя, мадэрнізацыя ліній электраперадачы. **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Людміла НІЖЭВІЧ** задала пытанне: «Ці гатовыя нашы сеткі забяспечыць падачу неабходнай магутнасці, асабліва ў сельскай мясцовасці? Якія перспектывы газазабеспячэння, як зменяцца цэны, ці ёсць нейкія льготныя праграмы па падтрымцы насельніцтва для пераводу ацяплення на электрычнасць?»

Віцэ-прэм'ер паведаміў, што населеныя пункты і дамы, да якіх падведзены газ, ніякіх льгот не атрымліваюць. У новай забудове стварэнне электраэнергетычнай інфраструктуры ўжо ўключана ў кошт будаўніцтва. Што да інфраструктуры на вёсцы, Міністэрства фінансаў і Міністэрства энергетыкі працягваюць дыялог.

Працягнуў «цёплую» тэму **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Дзмітрый ШАЎЦОЎ,** удакладніўшы, ці могуць садовыя таварыствы карыстацца льготным «трохкапеечным» тарыфам для аплаты ацяплення электраэнергіяй. **Міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ** растлумачыў, што першачарговая задача па стымуляванні выкарыстання электрычнай энергіі стаіць менавіта па жыллёвым фондзе. Пытанне адносна садовых таварыстваў зараз абмяркоўваецца асобна, канчатковыя рашэнні могуць быць унесены на разгляд да канца года.

**Старшыню Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Валерыя ГАЙДУКЕВІЧА** хваляваў далейшы лёс няякаснай нафты.

«Мазырскі НПЗ, які не меў альтэрнатыўнай крыніцы, быў вымушаны берагчы абсталяванне і працаваць на зніжаных нагрузках. Са строю выйшла абсталяванне на дваццаць мільёнаў долараў. У жніўні прадугледжаны планавы капітальны рамонт прадпрыемства, сумы будуць прад'яўлены да кампенсацыі», — паведаміў Ігар Ляшэнка.

Па словах віцэ-прэм'ера, балансава ў трубаправодзе знаходзілася 1200 тысяч тон нафты, па меры падачы па адной з труб чыстай вадкасці забруджаная «выціскалася» па іншай у Расію.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Законы эфектыўнага развіцця

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вядзецца сур'ёзная работа па карэкціроўцы Грамадзянскага кодэкса. Яе мэта — забеспячэнне прывабнасці нашай краіны для інвестыцый і вядзення бізнесу. Мы ўлічваем уласны і замежны вопыт. Гэтыя пытанні разглядаліся ў маі на секцыі навукова-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі. Да мерапрыемства праявілі цікавасць прадстаўнікі дзяржаўных органаў, навуковых і бізнес-колаў, члены судзейскай і адвакацкай супольнасці.

Паважаныя калегі!

Ва ўрадзе зараз актыўна абмяркоўваецца набор дзейсных інструментаў развіцця эканомікі краіны ў 2020 годзе. Савет Рэспублікі прапанаваў Савету Міністраў правесці ўжо ў 2019 годзе прапрацоўку асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2025 года, што дазволіць парламенту забяспечыць своечасовую падрыхтоўку неабходных законапраектаў. І ў першую чаргу варта паскорыць карэкціроўку заканадаўства з улікам нормаў Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 лістапада 2017 года № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». На восеньскай сесіі 2019 года пажадана ўнесці неабходныя змяненні ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Акрамя таго, трэба актывізаваць работу па ўдасканаленні нормаў законаў «Аб гаспадарчых таварыствах», «Аб неплацежаздольнасці і банкруцтве», «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання». Мяркуем, што не страчана актуальнасць і ў законапраектах аб дзяржаўных арганізацыях і аб электраэнергетыцы. Разлічваем сёлета атрымаць прапановы Савета Міністраў па гэтых законапраектах.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Работа з насельніцтвам з'яўляецца для парламентарыяў безумоўным прыярытэтам. Нядаўна Прэзідыум Савета Рэспублікі дэталёва разгледзеў работу членаў Савета Рэспублікі са зваротамі грамадзян за мінулы год, прааналізаваў тэматыку паступіўшых зваротаў і якасць работы з імі. Так, у 2018 годзе сенатарамі праведзена больш за 1,5 тыс. асабістых прыёмаў, у ходзе якіх разгледжана 7 тыс. зваротаў. У І квартале 2019 года праведзена 285 асабістых прыёмаў, прыняты 924 чалавекі. Аналіз зваротаў паказаў, што каля трацціны з іх датычыцца матэрыяльнага становішча грамадзян: заработная плата, працаўладкаванне. Другі блок пытанняў — медыцынскае абслугоўванне, работа дзіцячых дашкольных устаноў і школ. Трэцяя па ліку зваротаў група пытанняў — стан і рамонт жыллёвага фонду, добраўпарадкаванне.

Работа са зваротамі грамадзян дае станоўчыя вынікі. Варта цаніць давер людзей да ўлады. Нам трэба і далей актыўна весці гэту дзейнасць, выкарыстоўваючы новыя формы і метады. Па выніках прыёмаў павінны прымацца канкрэтныя рашэнні, фармальны падыход недапушчальны.

Варта больш поўна даводзіць да грамадскасці звесткі аб бюджэтных выдатках, на што яны накіроўваюцца. Павінны быць не толькі справаздачы, але і інфармаванне аб тым, што будзе зроблена і калі.

Для найбольш эфектыўнага вырашэння пытанняў, якія паступаюць ад насельніцтва, неабходна максімальна задзейнічаць мясцовыя Саветы дэпутатаў і іх асацыяцыі. Па ініцыятыве Савета Рэспублікі такія асацыяцыі былі створаны і функцыяніруюць у Магілёўскай і Гродзенскай абласцях. Нядаўна аналагічная структура сфарміравана і ў Віцебскай вобласці. Разлічваем на яе актыўную работу.

Асаблівую ўвагу Савет Рэспублікі ўдзяляе развіццю маладзёжнага парламентарызму. У Беларусі працуе звыш 40 маладзёжных парламенцкіх структур — абласных, раённых і гарадскіх. Нядаўна маладзёжны парламент створаны і пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў. Гэты кірунак павінен развівацца больш актыўна. Члены Савета Рэспублікі разам з Саветамі дэпутатаў павінны імкнуцца да таго, каб гэта дзейнасць была эфектыўная для фарміравання маладых лідараў і карысная краіне.

Паважаныя калегі!

Міжнародная дзейнасць Савета Рэспублікі ў бягучай сесіі была накіравана на ўсталяванне новых і пашырэнне дзеючых міжпарламенцкіх сувязяў. Прайшлі візіты і сустрэчы высокага ўзроўню з дэлегацыямі Польшчы, Францыі, Чэхіі, Славакіі, Латвіі, Германіі. Развіваецца супрацоўніцтва з Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы. Актывізавалася міжпарламенцкае супрацоўніцтва з КНР, актыўна ідзе работа з парламентарыямі Расійскай Федэрацыі.

У найбліжэйшы час нам трэба будзе правесці на высокім узроўні VI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу, а таксама Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана.

Прашу членаў Савета Рэспублікі прадоўжыць актыўную работу па падрыхтоўцы гэтых мерапрыемстваў, асаблівую ўвагу ўдзяліць падпісанню камерцыйных кантрактаў і пагадненняў аб супрацоўніцтве. На Форум мы выходзім з шэрагам ініцыятыў і разлічваем на іх падтрымку.

У цэнтры ўвагі Савета Рэспублікі працягваюць заставацца пытанні ўдасканалення дагаворна-прававой базы еўразійскай інтэграцыі, а таксама саюзнага будаўніцтва. У Савеце Рэспублікі былі выпрацаваны і накіраваны ва ўрад канкрэтныя прапановы па далейшым развіцці беларуска-расійскай інтэграцыі.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Дазвольце падзякаваць вам за сумесную плённую сесійную работу. У адпаведнасці з артыкулам 95 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь шостую сесію Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання аб'яўляю закрытай.

# Фактары ўстойлівага росту

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У рамках сваіх кантрольных паўнамоцтваў дэпутаты зацвердзілі справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за 2018 год. Вынікі праведзенага аналізу трэба ўлічыць падчас падрыхтоўкі бюджэтных законапраектаў на чарговы фінансавы год.

Даволі сур'ёзны пакет разгледжаных на сесіі дакументаў накіраваны на павышэнне якасці жыцця нашых грамадзян. У прыватнасці, прынята новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса, унесены запатрабаваныя папраўкі ў працоўнае заканадаўства, законы па пытаннях аховы здароўя, прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя.

Працягвалася сістэмная работа па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі, законнасці і правапарадку. Асноўны акцэнт тут быў зроблены на ўзмацненні барацьбы з экстрэмізмам і распаўсюджваннем нацысцкай ідэалогіі. Таксама сталі больш жорсткімі меры супраць выкарыстання допінгу ў спорце.

Адначасова быў ажыццёўлены і шэраг паслядоўных крокаў, накіраваных на гуманізацыю крымінальнага заканадаўства. Перш за ўсё трэба адзначыць завяршэнне работы над праектам закона, асобныя нормы якога мелі шырокі грамадскі рэзананс. Гаворка ідзе пра зніжэнне ніжніх межаў пакарання за незаконны абарот наркатычных сродкаў.

Хачу падкрэсліць: пазіцыя дзяржавы ў адносінах да гандляроў наркотыкамі не змянілася. Мы і надалей будзем прымаць супраць іх самыя жорсткія меры.

Пэўнае змякчэнне крымінальнага закона не з'яўляецца паслабленнем для наркадылераў і сеткавых збытчыкаў гэтага смяротнага тавару. Разам з тым суддзі пры вызначэнні пакарання змогуць у поўнай меры ўлічыць асобу вінаватага, яго ўзрост, ступень грамадскай небяспекі ўчынку і ўсе абставіны яго здзяйснення.

Яшчэ адным важным актам гуманізму з боку дзяржавы стала прыняцце закона аб амністыі, закліканага даць грамадзянам, якія спатыкнуліся, магчымасць пачаць новае жыццё і інтэгравацца ў грамадства.

Паважаныя дэпутаты!

Звяртаючыся з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу, Прэзідэнт паставіў задачу правесці парламенцкія выбары восенню гэтага года. Таму мы павінны сур'ёзна скарэктаваць свае планы і паскорыць заканатворчы працэс, каб дастойна завяршыць скліканне.

Аб'ём будучай работы дастаткова вялікі. Мяркуйце самі — толькі за гэту сесію мы прынялі 30 законапраектаў у першым чытанні. Іх усе трэба якасна дапрацаваць і аператыўна прыняць. Акрамя таго, да нас пастаянна паступаюць новыя дакументы.

Зразумела, асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць бюджэту, паколькі яго разгляд па існуючай традыцыі — гэта абавязак адыходзячага склікання. Пры гэтым трэба памятаць, што 2020 год завяршае пяцігодку. І ад таго, наколькі збалансаваным і рэалістычным будзе галоўны фінансавы дакумент, у многім залежыць паспяховае выкананне планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Так што заключная сесія Палаты прадстаўнікоў будзе вельмі насычаная. Тым больш што часу ў нас будзе менш, чым звычайна. Але гэта ніяк не павінна адбіцца на якасці законапраектаў і тэрмінах іх разгляду. Карацей, у найбліжэйшыя месяцы мы будзем працаваць у звыклым напружаным рытме.

Тое ж самае можна сказаць і ў дачыненні да нашай міжнароднай праграмы. Тут, дарэчы, мы напрацавалі дастаткова добрую аснову для нарошчвання двухбаковых сувязяў. Гэтаму садзейнічалі афіцыйныя візіты ў Беларусь старшыні Нацыянальнага савета Славацкай Рэспублікі, парламенцкіх дэлегацый Кітая і Таджыкістана.

Вельмі змястоўна і канструктыўна прайшла наша сустрэча з Прэзідэнтам Егіпта. Яна пацвердзіла ўзаемнае імкненне развіваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва як у палітычнай, так і ў эканамічнай сферах.

Паспяховымі былі чарговыя раўнды кансультацый з калегамі з Германіі і Латвіі, прадстаўнікамі міжнародных арганізацый і кіраўнікамі дыпламатычных місій Азербайджана, Арменіі, Канады, Рэспублікі Карэя і Румыніі.

Развіццю гандлёва-эканамічных, адукацыйных і культурных сувязяў з краінамі далёкага замежжа садзейнічаў візіт беларускіх дэпутатаў у Японію.

Зараз вельмі важна наладзіць дакладную работу па рэалізацыі ўсіх дасягнутых дамоўленасцяў і намецціць новыя, больш канкрэтныя, кірункі супрацоўніцтва, якія могуць быць рэалізаваны наступным скліканнем.

Што датычыцца беларуска-расійскіх адносін, то галоўнай падзеяй тут, безумоўна, стала правядзенне ў Мінску 56-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Яна прайшла пад знакам выпрацоўкі стратэгіі паглыблення інтэграцыі. Разгледзеўшы ход выканання праграмных дакументаў, якія вызначаюць развіццё саюзнага будаўніцтва, парламентарыі прынялі рашэнне ўзмацніць кантроль за іх рэалізацыяй.

Актыўны ўдзел беларускія дэпутаты ўзялі і ў абмеркаванні актуальных пытанняў шматбаковага парадку. Асноўны дыялог быў разгорнуты на пляцоўках Парламенцкай асамблеі АДКБ, Міжпарламенцкай асамблеі СНД і Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

Атрымалі сваё развіццё кантакты з нашымі еўрапейскімі калегамі. У гэтым плане трэба адзначыць удзел беларускіх парламентарыяў у пасяджэнні Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі; мерапрыемстве, арганізаваным Паўночным саветам у парламенце Швецыі; сустрэчы спікераў парламентаў краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а таксама ў парламенцкім форуме па пытаннях разведкі і бяспекі.

У ліку найбольш важных мерапрыемстваў, праведзеных у Мінску, безумоўна, варта назваць міжнародную канферэнцыю Групы падтрымкі Шаўковага шляху ПА АБСЕ. Члены Групы па заслугах ацанілі інвестыцыйны, лагістычны, турыстычны патэнцыял нашай краіны і выказалі зацікаўленасць у развіцці прамых дзелавых кантактаў.

Падчас форуму старшыня ПА АБСЕ і кіраўнікі нацыянальных дэлегацый пацвердзілі высокую ацэнку ініцыятывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Хельсінкі-2» і пазітыўна адазваліся аб той ролі, якую адыгрывае беларуская парламенцкая дэлегацыя ў ПА АБСЕ па яе прасоўванні.

Наперадзе ў нас не менш насычаная міжнародная праграма. Ужо ў найбліжэйшы час беларускія парламентарыі накіруюцца ў Люксембург для ўдзелу ў 28-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Традыцыйна на яе разгляд будзе ўнесены праект беларускай рэзалюцыі, прысвечанай гэтым разам умацаванню супрацоўніцтва ў галіне тэхналагічнага прагназавання. Хочацца пажадаць нашай дэлегацыі плённай працы і поспехаў у прасоўванні гэтага праекта для ўключэння ў выніковую дэкларацыю.

У ліку іншых буйных міжнародных мерапрыемстваў варта назваць 28-ю сесію Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора, якая адбудзецца ў Нарвегіі, чацвёртую нараду спікераў парламентаў краін Еўразіі (яна пройдзе ў Казахстане), 40-ю Генеральную асамблею Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН у Тайландзе і 141-ю Асамблею Міжпарламенцкага саюза ў Сербіі.

Наш удзел у гэтых мерапрыемствах неабходна выкарыстоўваць для ўмацавання суверэнітэту і актыўнага прасоўвання на міжнароднай арэне беларускіх ініцыятыў, накіраваных на ўдасканаленне архітэктуры міжнароднай бяспекі, супрацоўніцтва і даверу.

Паважаныя калегі!

Нягледзячы на шырокую праграму міжпарламенцкага супрацоўніцтва і аб'ёмы заканадаўчых задач, якія нам трэба будзе вырашаць у найбліжэйшыя месяцы, нам нельга зніжаць актыўнасць у выбарчых акругах.

Захаванне грамадзянскага міру і грамадскай згоды, адкрыты і сумленны дыялог з усімі, хто гатовы працаваць на карысць Беларусі, — першарадная задача дэпутацкага корпуса. Менавіта пра гэта гаварыў кіраўнік дзяржавы ў сваім Пасланні.

Трэба больш актыўна падтрымліваць грамадскія ініцыятывы, уцягваць структуры грамадзянскай супольнасці ў выпрацоўку найбольш значных пытанняў як мясцовага, так і рэспубліканскага значэння. Творчы патэнцыял нашых грамадзян — гэта найважнейшы рэсурс рэалізацыі дзяржаўнага курсу на павышэнне якасці жыцця і дабрабыту насельніцтва.

Толькі аб'яднаўшыся, кансалідуючы свае намаганні, мы зможам забяспечыць мірнае і ўстойлівае развіццё моцнай, незалежнай Беларусі.

# Вялікае свята завяршаецца

## Развітальны акорд заўтра

**У дні II Еўрапейскіх гульняў Мінск пачаў размаўляць на дзясятках моў, тысячы балельшчыкаў з усяго свету сабраліся тут, каб паназіраць за выступленнямі сваіх любімых спартсменаў. А заадно і пазнаёміцца з беларускай сталіцай, а таксама культурнай і гістарычнай спадчынай усёй Беларусі.**

Большасць узнагарод Еўрапейскіх гульняў у Мінску ўжо разыграна, за гэтыя дні на спартыўныя арэны выйшлі тысячы спартсменаў, у тым ліку сусветныя зоркі, рэкардсмены і алімпійскія чэмпіёны з 50 краін Еўропы. Вачыма сотняў журналістаў з усяго свету самую буйную спартыўную падзею гэтага лета ўбачылі аматары спорту ўсёй планеты.

Апошнім акордам Гульняў стане цырымонія закрыцця, якая заўтра адбудзецца на Нацыянальным алімпійскім стадыёне «Дынама». Ужывую ў Мінску яе змогуць убачыць 22 тысячы чалавек, а таксама мільёны тэлегледачоў ва ўсім свеце.






Ключавымі героямі цырымоніі стануць самі спартсмены, члены дэлегацый краін-удзельніц, валанцёры і, вядома ж, балельшчыкі, якія падтрымлівалі атлетаў на працягу 10 дзён спаборніцтваў. У шоу прымуць удзел 4500 валанцёраў і каля 2000 спартсменаў. Па словах рэжысёра-пастаноўшчыка шоу Аляксея Сечанава, «цырымонія закрыцця — гэта заўсёды падвядзенне вынікаў. Вынікаў дзесяці спаборніцкіх дзён, якія былі напоўнены не толькі захапленнем і радасцю перамог, але і слязамі расчаравання. Каля чатырох тысяч спартсменаў сабралася ў Мінску, каб выканаць свае мары. І чыесьці мары спраўдзіліся, а хтосьці паставіў сабе новыя мэты, правёўшы работу над памылкамі. Гэта будзе маляўнічае, маштабнае шоу, над якім працуе вялікая шматнацыянальная рэжысёрска-пастановачная група. Госці і гледачы цырымоніі змогуць прагартаць яркі альбом успамінаў, яшчэ раз акунуцца ў атмасферу спаборніцкіх дзён і адчуць тыя самыя эмоцыі, якія перажывалі спартсмены і іх трэнеры».

Спецыяльна да цырымоніі закрыцця створаны ўнікальны відэарад, які раскрые патаемныя моманты і шчырыя эмоцыі вялікага спорту. Кожны эпізод прысвечаны пэўнай грані спорту. Музычным суправаджэннем тэатралізаваных эпізодаў мерапрыемства стануць вядомыя сучасныя кампазіцыі. Адно з цэнтральных месцаў у цырымоніі адведзена сучаснай Беларусі. Стваральнікі шоу натхняліся прадстаўнікамі прагрэсіўнай моладзі Беларусі, іх ідэямі, у якіх інтэлект, адукаванасць, культура спалучаюцца з сапраўдным драйвам і імкненнем да самаўдасканалення. Энергія беларускай моладзі, энергія атлетаў, спартсменаў-удзельнікаў II Еўрапейскіх гульняў знойдуць сваё адлюстраванне ў нядзельнай пастаноўцы.

У рамках цырымоніі закрыцця Гульняў выступяць шырока вядомыя беларускія выканаўцы — групы IOWA, J:Морс, Tesla Boy і «Лепрыконсы». У лік запрошаных артыстаў увойдуць таксама народны артыст Расіі, Украіны і Чачэнскай Рэспублікі Мікалай Баскаў і заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Аксана Волкава.

Таксама ва ўрачыстай цырымоніі закрыцця Гульняў плануецца ўдзел высокіх гасцей, прэзідэнта Таджыкістана Эмамалі Рахмона і прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна.

Прамую трансляцыю ўрачыстага закрыцця ў 21:55 пачнуць каналы «Беларусь 1», «Беларусь 5», «Беларусь 5. Інтэрнэт», а таксама сайт медыяхолдынга tvr.by.

*За час турніру госці, спартсмены і спартыўныя менеджары выказалі мноства водгукаў пра II Еўрапейскія гульні і пра Беларусь у цэлым. Прыводзім некаторыя з іх:*

**Кіраўнік Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Свен Арнэ ХАНСЭН:**

— Мінск для мяне з'яўляецца адным з найпрыгажэйшых гарадоў Еўропы. Мне вельмі спадабалася цырымонія адкрыцця Еўрапейскіх гульняў, яна была відовішчнай, цікавай, проста выдатнай. Новы фармат спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы, які быў паказаны на Гульнях, — гістарычны момант, я вельмі рады, што ён адбыўся менавіта ў Мінску.

**Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА:**

— У II Еўрапейскіх гульняў бліскучая арганізацыя. Я быў на адкрыцці і пераканаўся ў тым, што сапраўды Рэспубліка Беларусь уклала душу ў тое, каб гэтыя гульні адбыліся на высокім сусветным узроўні. А якія вынікі будуць канчатковыя — гэта залежыць ад спартсменаў, а не ад арганізатараў. Я думаю, што для спартсменаў тут створаны ўсе неабходныя ўмовы.

**Грэчаскі велагоншчык Хрыстас ВАЛІКАКІС:**

— Старты такога ўзроўню не бываюць лёгкія, у Беларусі сабраліся спартсмены высокага ўзроўню, імёны якіх вядомыя ва ўсім свеце. Я часта прыязджаю выступаць у Мінск. Тут мне падабаецца, я адчуваю сябе шчаслівым. У маёй калекцыі ўзнагарод ёсць тыя, што былі выйграны менавіта тут. Праўда, горад паглядзець ніяк не атрымліваецца: увесь час праводжу на трэніроўках або ў гасцініцы. Так што любімае месца ў мяне пакуль адно — веладром «Мінск-Арэны».

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Малдовы ў Беларусі Віктар САРАЧАН:**

— Усе вельмі задаволеныя ўмовамі. Маштабы Гульняў уразілі, таму што прыняць пяць тысяч чалавек адначасова на адной тэрыторыі, каб ім было камфортна, накарміць іх своечасова, смачна і карысна — гэта шмат чаго варта. Для нас гэта было дзіўна. У спартсменаў няма пытанняў па размяшчэнні, усё вельмі добра, вольны час арганізаваны, добра працуе транспарт. Вельмі шмат людзей: шматгалоссе, шматмоўе. Маса ўражанняў, як арганізаваны фан-зоны. Добра, што ёсць дні розных краін, канцэрты, забавы і разнастайная ежа. Тое, як арганізаваны гэтыя Гульні, наколькі адказна падышлі мясцовыя ўлады, я вам скажу, што гэта ўзровень еўрапейскі і сусветны. Мы бачылі шмат спаборніцтваў, і як усё зроблена тут — гэта выдатна. Ужо вядома, хто будзе наступным гаспадаром Гульняў, ім будзе складана вас пераскочыць.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**Фота БелТА.**

## ПЕРАМОГІ, ЯКІЯ ДАПАМАГАЮЦЬ ІНШЫМ

**У пятніцу на Еўрапейскіх гульнях было разыграна 12 камплектаў узнагарод у пяці відах спорту. Асаблівую цікавасць выклікаў фінал спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы, у якім сапернічалі зборныя Беларусі, Францыі, Італіі, Чэхіі, Украіны і Германіі.**

На веладроме «Мінск-Арэны» разыграны пяць камплектаў узнагарод па трэкавых гонках. У Палацы спорту чатыры камплекты медалёў знайшлі ўладальнікаў у турніры па жаночай барацьбе. Заключны від спаборніцтваў прайшоў і па стэндавай стральбе. Паўфінальныя матчы па пляжным футболе адбыліся на стадыёне САК «Алімпійскі», Швейцарыя згуляла з Іспаніяй, а Украіна з Партугаліяй. Медальныя паядынкі ў гэтым відзе спорту адбудуцца сёння. Нагадаем, беларусы ў пляжным футболе выбылі з барацьбы за ўзнагароды. На рынгу палаца спорту «Уручча» ў пятніцу таксама прайшлі паўфінальныя баі баксёрскіх спаборніцтваў.

Працягваецца праект «Алімпійскі шлях». Прадстаўнікі зборнай Беларусі па веславанні на байдарках і каноэ, якія сталі пераможцамі і прызёрамі II Еўрапейскіх гульняў, падтрымалі розныя спартыўныя школы. Алена Наздрова, якая выйграла ў каноэ на дыстанцыі 200 м, зрабіла падарунак у памеры 15 тыс. рублёў гомельскай СДЮШАР «Дэльфін», дзе спартсменка пазнаёмілася з весланнем. Парадавалі на мінулых стартах у Заслаўі выхаванцы Магілёўскай абласной СДЮШАР прафсаюзаў «Бярэзіна». Надзея Макарчанка і Вольга Клімава ў каноэ-двойцы сталі другімі на дыстанцыі 500 м. Дуэт у якасці адрасата для фінансавай дапамогі ў 10 тыс. рублёў абраў менавіта гэтую спартшколу, дзе займалася Надзея Макарчанка. Поспех дзяўчат на кароткіх дыстанцыях падтрымаў байдарачнік Дзмітрый Траццякоў, яго выбар (7,5 тыс. рублёў) таксама быў зроблены на карысць СДЮШАР прафсаюзаў «Бярэзіна», дзе Дзмітрый пачынаў свой шлях у спорце.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Мэй разлічвае перадаць паўнамоцтвы прэм'ера свайму пераемніку 24 ліпеня



Пра гэта паведаміў афіцыйны прадстаўнік дзеючага кіраўніка ўрада Вялікабрытаніі, словы якога прыводзіць агенцтва Reuters. Новы прэм'ер павінен быць зацверджаны на пасадзе каралевай Вялікабрытаніі Лізаветай II, якая перад гэтым прыме адстаўку Тэрэзы Мэй. Раней Кансерватыўная партыя Вялікабрытаніі пацвердзіла, што імя яе новага лідара, які зойме пасаду кіраўніка ўрада пасля адстаўкі Мэй, стане вядома 23 ліпеня.

### Ва Украіне распачнуцца сумесныя з ЗША вучэнні Sea Breeze 2019

«1 ліпеня ва Украіне пачнуцца ўкраінска-амерыканскія вучэнні Sea Breeze 2019. Традыцыйна яны будуць праходзіць на моры, сушы, у паветры і пад вадой», — праінфармавала прэс-служба Дзяржаўнай пагранічнай службы Украіны. У марскім кампаненце вучэнняў, паведамілі ў Дзяржпагранслужбе, запланаваны артылерыйскія стрэльбы, высадкі наглядных груп, удасканаленне ўзаемадзеяння спецыяльных падраздзяленняў, таксама пройдуць спецыялізаваныя вадалазныя трэнінгі.

### Урон сельскай гаспадарцы Сірыі ў выніку канфлікту склаў $16 млрд



Фінансавыя страты сельскагаспадарчай галіны ў сувязі з крызісам у Сірыі за перыяд з 2011 да 2016 года склалі 16 мільярдаў долараў, расказаў у інтэрв'ю РІА «Навіны» міністр сельскай гаспадаркі САР Ахмад аль-Кадэры. «Сельскагаспадарчая галіна — адна з найбольш пацярпелых ад крызісу», — заўважыў эксперт. Па словах міністра, такія страты ў першую чаргу звязаны з эканамічнымі санкцыямі і аднабаковымі мерамі, прынятымі ў дачыненні да Сірыі. Гэта выяўляецца «шляхам зніжэння вытворчасці, як вынік гэтых санкцый у дадатак да разбурэнняў і вываду з эксплуатацыі навуковых, вытворчых і абслуговых цэнтраў, а таксама праз абмежаванне доступу фермераў у некаторых раёнах да іх зямель», — сказаў аль-Кадэры.

Стыхія

## Пацярпелі ад моцнага ветру

**Паводле аператыўных звестак МНС, з прычыны парываў ветру (да 20 м/с) у чацвер пацярпелі 18 населеных пунктаў у Гомельскай (Веткаўскі, Жлобінскі, Рэчыцкі і Чачэрскі раёны), Мінскай (Дзяржынскі і Мінскі раёны) і Магілёўскай (Бабруйскі, Кіраўскі і Слаўгарадскі раёны) абласцях.**

Пашкоджаны дахі 26 жылых дамоў, трох аб'ектаў сацкультбыту і 45 сельскагаспадарчых будынкаў. Паступала паведамленне аб адключэнні электраэнергіі ў ЗАТ «Птушкафабрыка Вішнёўка» і філіяле «Агракамбінат КХП» ААТ «Бабруйскі камбінат хлебапрадуктаў» у вёсцы Вішнёўка Бабруйскага раёна. Для электразабеспячэння задзейнічаліся дызель-генератары МНС і РУП «Магілёўэнерга».

Па звестках ДВА «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 642 населеных пунктаў.

У Мазыры моцны парыў ветру зламаў галіну дрэва, якая траўміравала 12-гадовага хлопчыка. Ён гуляў у паркавай зоне каля фантана, калі адбылося гэта здарэнне. Пацярпелага шпіталізавалі з дыягназам «цяжкая адкрытая чэрапна-мазгавая траўма».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Галоўная мара акадэміка Мрочака

**10 гадоў таму ў Беларусі была паспяхова праведзена першая перасадка сэрца маладой жанчыне, якая пакутавала на складанае захворванне. Гэта было вялікае дасягненне не толькі калектыву хірургаў РНПЦ «Кардыялогія», але і ўсёй беларускай медыцыны, якое паклала пачатак паспяховаму развіццю транспланталогіі сэрца ў нашай краіне.**
**З дырэктарам РНПЦ «Кардыялогія», акадэмікам Аляксандрам МРОЧАКАМ мы гаварылі пра перспектывы павелічэння працягласці жыцця, пра выкарыстанне 3D-тэхналогій у кардыяхірургіі і пра тое, як работа над выратаваннем чалавечага сэрца стала прадметам навуковых даследаванняў і справай усяго яго жыцця...**

***— Аляксандр Генадзевіч, што прывяло вас у медыцыну? Чаму выбралі менавіта кардыялагічную спецыяльнасць?***

— Гэта і выпадковасць, і заканамернасць. Яшчэ ў школе ў старшых класах цікавіўся хіміяй і біялогіяй. Мама да таго ж выкладала хімію ў школе. Кантроль быў вельмі строгі *(усміхаецца)*. Я выдатна ведаў фізіку. А ў тыя гады былі найвялікшыя адкрыцці ў галіне біялогіі і медыцыны, за іх прысуджаліся Нобелеўскія прэміі. Усё гэта, вядома ж, аказала ўплыў на мой выбар: я паступіў у медыцынскі інстытут.

**«Мы развілі кардыяхірургію практычна ў кожным абласным цэнтры. Наша сістэма ўсё больш падобная на заходнюю, дзе шматпрофільныя бальніцы маюць кардыялагічныя аддзяленні і аказваюць дапамогу ўсім пацыентам».**

А кардыялогія захапіла мяне падчас работы ў Мінскай абласной бальніцы, куды я трапіў па размеркаванні. У той перыяд абласная бальніца была вядучай спецыялізаванай установай у рэспубліцы. Там была база БелМАПА, там працавалі свяцілы нашай медыцыны — акадэмікі Вячаслаў Андрэевіч Мохарт і Аляксандр Уладзіміравіч Руцкі, прафесар Ігар Мікалаевіч Грышын і мой настаўнік — прафесар Уладзімір Васілевіч Гарбачоў. Я зацікавіўся навукай, паступіў у аспірантуру... І якраз у той год выйшла пастанова Савета Міністраў СССР, якая дала «зялёнае святло» стварэнню кардыялагічнай службы ў Беларусі. Вось так і атрымалася, што я стаў кардыёлагам і стаяў каля вытокаў стварэння гэтай службы ў нашай краіне.

***— У 29 гадоў вы абаранілі кандыдацкую, у 35 — сталі доктарам медыцынскіх навук, у 38 — прафесарам, у 51 — членам-карэспандэнтам, у 55 — дырэктарам РНПЦ «Кардыялогія», у 56 — акадэмікам. Сёння вы яшчэ і кіраўнік рэспубліканскай навуковай школы арытмолагаў, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь... І гэта не поўны пералік вашых дасягненняў. У чым жа сакрэт поспеху акадэміка Мрочака?***

— Адназначна не адкажу на гэта пытанне. Напэўна, у любові да жыцця, да людзей, у вялізным жаданні дапамагчы ім. Так, і, магчыма, бацькі падкінулі нейкі ген, які дазволіў рэалізаваць мне большасць сваіх ідэй і не страціць пры гэтым цікавасць да жыцця, прафесіі, навукі.

***— Аляксандр Генадзевіч, сёння аперацыі па перасадцы сэрца ў нашай краіне ўжо не рэдкасць. Вы называеце сучасную кардыялогію медыцынай высокіх дасягненняў. Што ў арсенале беларускіх кардыёлагаў сёння?***

— Нашы кардыяхірургі асвоілі высокатэхналагічныя аперацыі, пра якія гадоў



10 таму нават не марылі. Дасягненні інтэрвенцыйнай медыцыны набываюць сёння масавы характар, і ўсё большая колькасць пацыентаў з усіх рэгіёнаў краіны можа разлічваць на аперацыйную дапамогу беларускіх урачоў-кардыёлагаў. Уявіце сабе на хвіліну: праз артэрыяльны і вянозны доступ з дапамогай спецыяльнага зонда можна імплантаваць клапан сэрца, не траўміруючы паверхню цела чалавека. Такое ўмяшанне — гэта ўжо не складаная поласцевая аперацыя, як было раней, бо літаральна на трэці-чацвёрты дзень наш пацыент выпісваецца са стацыянара.

Сёння ў галіне інтэрвенцыйнай кардыялогіі больш за ўсё інавацый і патэнтаў на вынаходкі, а таксама і новых падыходаў у тактыцы лячэння пацыентаў. Мы ў сваёй рабоце шырока выкарыстоўваем 3D- і нанатэхналогіі, праводзім гібрыдныя аперацыі, асвойваем мікрахірургічныя ўмяшанні пад мікраскопам.

***— Наколькі дапамога такога высокага ўзроўню даступная насельніцтву, якое пражывае ў аддаленых рэгіёнах, ды і ў Мінску? І якія кірункі ў рабоце РНПЦ «Кардыялогія» вы вызначаеце сёння як найбольш прыярытэтныя?***

— У апошнія дзесяцігоддзе мы пайшлі далёка наперад у частцы даступнасці высокатэхналагічнай кардыялагічнай дапамогі для ўсіх пластоў насельніцтва.

У РНПЦ «Кардыялогія» ў сярэднім за год выконваецца каля трох тысяч аперацый на сэрцы і сасудах. А ў цэлым па краіне — каля шасці тысяч. Сёння ўсе шматпрофільныя бальніцы краіны маюць кардыялагічныя аддзяленні, дзе аказваецца дапамога ўсім пацыентам. Тут ёсць магчымасць стэнціраваць каранарныя артэрыі, лячыць прыроджаныя парокі сэрца.

Раней на складаныя аперацыі ўсіх накіроўвалі ў Маскву, у цэнтр хірургіі імя Бакулева. Усе ведалі, што гэта быў цэнтральны інстытут у Савецкім Саюзе, куды ішоў паток пацыентаў для таго, каб рабіць самыя складаныя аперацыі. Сёння такога няма. Арганізаваўшы высокаэфектыўную арытмалагічную службу — хірургічную і інтэрвенцыйную, — мы вырашылі гэту праблему на месцы.

Мы развілі кардыяхірургію практычна ў кожным абласным цэнтры. Наша сістэма ўсё больш падобная на заходнюю, дзе шматпрофільныя бальніцы маюць кардыялагічныя аддзяленні і аказваюць дапамогу ўсім пацыентам.

Высокатэхналагічная кардыялогія — гэта і найноўшыя тэхналогіі, і наяўнасць сучаснага абсталявання, і, самае галоўнае, высокакваліфікаваны персанал, здольны на ім працаваць. У нас цяпер працуе вельмі шмат таленавітых маладых людзей, якія праходзяць падрыхтоўку на кафедрах РНПЦ «Кардыялогія», Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

Калі прыводзіць статыстыку, то ў наш час у краіне праводзіцца 600 аперацый па стэнціраванні сасудаў сэрца на адзін мільён насельніцтва. У выніку мы бачым змяненне дэмаграфічных паказчыкаў у лепшы бок, гэта значыць зніжэнне ўзроўню смяротнасці ад інфаркту міякарда і вострага каранарнага сіндрому. Гэта вельмі важна.

***— У выратаванні чалавечага жыцця важна своечасова паспець аказаць неабходную дапамогу. Якія магчымасці ёсць сёння ва ўрача-кардыёлага паліклінікі? Бо да яго ж штодня звяртаюцца людзі нават з самымі цяжкімі выпадкамі...***

— Хачу падкрэсліць, што ў сістэме аказання высокатэхналагічнай дапамогі вельмі важна, каб першапачаткова кваліфікавана спрацавала першаснае звяно аховы здароўя. Мы сёння ўжо маем магчымасць ставіць самыя складаныя тэхнічныя прылады, якія забяспечваюць чалавеку жыццё. Гэта і штучныя вадзіцелі рытму, імпланты-дэфібрылятары, і лячэнне сардэчнай недастатковасці з дапамогай рэсінхранізавальных прылад. Вось гэта ўсё, гэтыя нашы магчымасці павінны ведаць і там, на першасным узроўні. Урач, які сядзіць на прыёме паліклініцы, павінен быць гатовы да такой работы. На жаль, тут у нас ёсць пэўныя праблемы. Мы гэта ведаем, і Міністэрства аховы здароўя гэта ведае, таму ўмацаванне першаснага звяна аховы здароўя і арыентацыя на высокакваліфікаванага ўрача агульнай практыкі — адна з нашых першачарговых задач. Трэба рыхтаваць такіх урачоў на паток.

## Курс на біяінжынерыю

Восем гадоў таму ў аперацыйнай РНПЦ «Кардыялогія» ўпершыню была зроблена ўнікальная аперацыя: 30-гадоваму пацыенту была ажыццёўлена адначасовая перасадка сэрца і ныркі. Гэта быў адзіны шанц мужчыны на выздараўленне. Дзве брыгады хірургаў за 11 гадзін, што доўжылася аперацыя, здзейснілі сапраўдны цуд. І ўжо зроблены наступныя крокі — аднагасовая перасадка сэрца і печані, сэрца і лёгкага...

***— Аляксандр Генадзевіч, у многіх краінах ускладаюцца вялікія надзеі на магчымасці біяінжынерных тэхналогій па вырошчванні штучных органаў. Робіцца папулярным выкарыстанне ствалавых клетак. Як вы ставіцеся да такой перспектывы ў цэлым і, у прыватнасці, у дачыненні да нашых умоў?***

— Я думаю, што за гэтым будучыня. Цалкам для нас рэальная сітуацыя. Але гэта дарагая тэхналогія. З іншага боку, яе яшчэ трэба вывучаць. Пакуль гэты кірунак ідзе на ўзроўні адзінкавых клінічных выпрабаванняў, нават у большай ступені даклінічных.

Мы сёння актыўна вывучаем ствалавую клетку, для таго каб змяшчаць яе ў зоны сэрца, якія знаходзяцца ў стане ішэміі, або ў тыя месцы, дзе клетка загінула. Пакуль ідзе працэс вывучэння гэтага метаду. У многіх хворых мы бачым павышэнне скарачальнай здольнасці міякарда, а ў некаторых — няма гэтага эфекту. Ёсць розныя пункты гледжання на вырашэнне гэтай праблемы, але над гэтым трэба працаваць.

Укараненне высокіх тэхналогій у любой сферы заўсёды патрабуе немалых грошай. Ці да месца гаварыць пра імпартазамяшчэнне ў такім важным кірунку, як кардыяхірургія?

Напрыклад, тэхналогія замены клапана сэрца, пасля якой чалавек ужо праз тры дні можа ісці на работу. Мы яе асвоілі. Так, гэта дарога — такі клапан каштуе прыблізна 15—20 тысяч долараў. Вось чаму вострa стаіць пытанне імпартазамяшчэння ў гэтай сферы. У перспектыве, спадзяюся, недалёкай, мы павінны наладзіць вытворчасць такіх клапанаў у Беларусі.

Мы з акадэмікам Барысам Хрусталёвым заснавалі прадпрыемства ТАА «Політэхмед», на якім арганізаваны выпуск айчынных распрацовак. На базе гэтага прадпрыемства супрацоўнікі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта разам з нашымі спецыялістамі ўдзельнічаюць у даклінічных выпрабаваннях.

Нягледзячы на тое, што медыцына ступіла далёка наперад і ёсць фантастычныя вынікі, колькасць сардэчна-сасудзістых захворванняў павялічваецца. Працы ў нас не становіцца менш.

З іншага боку, мы назіраем рост працягласці жыцця.

**«Уявіце сабе на хвіліну: праз артэрыяльны і вянозны доступ з дапамогай спецыяльнага зонда можна імплантаваць клапан сэрца, не траўміруючы паверхню цела чалавека».**

***— Гэта заслуга медыцыны?***

— Я думаю, так. І паляпшэнне ўмоў жыцця чалавека. А з павелічэннем працягласці жыцця пераразмяркоўваюцца і фактары рызыкі захворванняў. Але ўсё ж на першым месцы пакуль, на жаль, сардэчна-сасудзістыя захворванні і анкалогія. Захворванні, над якімі мы зараз працуем, — яны ўзроставыя.

У 2011 годзе Яўген Іванавіч Чазаў, якому сёлета спаўняецца 90 гадоў, зрабіў цудоўны даклад на Еўразійскім кангрэсе кардыёлагаў у Мінску. Ён казаў пра выражаны ўплыў псіхалагічнага аспекту на рост сардэчна-сасудзістых захворванняў у насельніцтва. Артэрыяльная гіпертэнзія пры стрэсах з'яўляецца галоўным фактарам рызыкі.

Ды і большасць беларусаў не прывыкла несці адказнасць за сваё здароўе. Маларухомы лад жыцця, шкодныя звычкі і нежаданне займацца спартыўнымі нагрузкамі прывялі да таго, што артэрыяльная гіпертэнзія стала адной з самых распаўсюджаных хвароб.

Здавалася б, што тут складанага: матываваць насельніцтва, тое асяроддзе, дзе жывеш, на здаровы лад жыцця, каб гэтых фактараў рызыкі ў іх было менш. Што і казаць, статыстыка сведчыць, што наша нацыя курыць ледзь не найбольш у свеце.

Я разумею, што праводзіць гэтую работу — не задача РНПЦ «Кардыялогія», але казаць пра гэта мы абавязаны. Мы павінны больш інфармаваць насельніцтва пра фактары рызыкі. Я маю на ўвазе алкаголь і курэнне. Гэта не толькі асветніцкая праца, але і абмежавальныя меры. Напрыклад, СААЗ дэкларавала, што адным з фактараў абмежавання курэння з'яўляецца павелічэнне кошту цыгарэт.

***— Аб чым марыць акадэмік Мрочак?***

— Ведаеце, у школьныя гады я выпісваў часопіс «Техника — молодежи», у якім неяк быў апублікаваны графік павелічэння працягласці жыцця насельніцтва. Ён мяне вельмі ўразіў. Я запомніў: у 2000 годзе павінна было наступіць бяссмерце. Менавіта так і было напісана! Планавалася назапасіць такую колькасць ведаў, якая дазволіла б вырашыць усе пытанні па працягласці жыцця.

Цяпер мы разумеем, што гэта была ўтопія, назапашаных ведаў для бяссмерця недастаткова. Але мая мара працаваць над павелічэннем працягласці жыцця чалавека стала маёй прафесійнай задачай. За апошнія гады працягласць жыцця насельніцтва нашай краіны павялічылася прыблізна на 10 гадоў. Так што ў гэтым, спадзяюся, ёсць і невялікая часцінка маёй працы.

Якая мая самая запаветная мара? Дапамагаць па-ранейшаму людзям, рабіць іх жыццё больш шчаслівым і паўнавартасным.

**Наталля ЖАРКЕВІЧ.**
**Фота Паўла ШНІПА.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | СУП «Гомельская СПМК-119» ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Имущество, реализуемое одним лотом, в составе**

| п/п № | Наименование | Общая площадь, кв. м | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| 1 | Склад | 498,2 | 350/С-78153 |
| 2 | Мастерские | 145,2 | 350/С-78159 |
| 3 | Здание склада карбида кальция и газа пропан-бутан | 24,2 | 350/С-115683 |
| 4 | Здание гаража со складом кислорода | 134,5 | 350/С-115684 |
| 5 | Здание авторемонтных мастерских | 441,9 | 350/С-115685 |
| 6 | Легкотипный навес | 124,3 | 350/С-115687 |
| 7 | Ограждение металлическое | - | 70127 |
| 8 | Кабельные линии электроснабжения | - | 350/С-86527 |

В том числе зеленые насаждения: Туя (8 шт.); яблоня (3 шт.); Береза (5 шт.)

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок площадью **0,9134 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов промышленности |

**Местонахождение предмета электронных торгов: г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а**

**Начальная стоимость лота – 331 857,00 бел. руб.**

**Шаг электронных торгов – 16 592,85 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после электронных торгов. |

Предыдущее извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» 11.05.2019

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 17.07.2019** в **11.00** на ЭТП **www.ipmtorgi.by** Аккредитованному участнику, подавшему на адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае непрохождения регистрации участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация)** по **15.07.2019** до **17.00** на ЭТП www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 44 704-92-06; auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона / оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | ООО «ВЛАДИОЛТРАНС», г. Минск, ул. Некрасова, д. 47, комн. 7, 4-й этаж, адм. пом. № 13 |

Предмет электронных торгов:
административный корпус (здание административно-хозяйственное) общей площадью 5637,8 кв. м, инв. номер 610/С-17607, расположенный по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, аг. Лошница, ул. Рабочая, д. 1. Составные части и принадлежности: подвал, две пристройки

**Начальная цена без учета НДС: 117 080,76 бел. руб.**
(шаг аукциона: 5 854,04 бел. руб.)

**Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,6326 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания административного корпуса

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, Кудренок Елена Александровна, контактный телефон +375 (29) 644-38-92 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на Р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но **не позднее тридцати дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить Организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение, а также возместить Продавцу затраты по публикации извещений в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 31.07.2019** в 12.00, на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 29.07.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 31 марта 2019 года

| | |
|---|---|
| Организация | ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс» |
| Учетный номер плательщика | 100599687 |
| Вид экономической деятельности | Логистические услуги |
| Организационно-правовая форма | Общество с дополнительной ответственностью |
| Орган управления | Собрание учредителей |
| Единица измерения | Тысячи рублей |
| Адрес | 220113, г. Минск, ул. Кульман, 1/3-50 |

| **Активы** | **Код строки** | **На 31 марта 2019 года** | **На 31 декабря 2018 года** |
|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 18 964 | 16 608 |
| Нематериальные активы | 120 | 36 | 36 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | | 481 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | | 995 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **19 000** | **18 120** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 431 | 413 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 431 | 413 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 119 | 201 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 403 | 299 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 21 921 | 23 928 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | 347 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 1 | 13 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **22 875** | **25 201** |
| **БАЛАНС** | **300** | **41 875** | **43 321** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 280 | 280 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | (1) | (1) |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 12 107 | 12 146 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (2 086) | (2 118) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 195 | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **10 495** | **10 307** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 14 948 | 17 860 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 1 637 | 763 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **16 585** | **18 623** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 9 773 | 9 189 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 5 022 | 5 202 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 2 218 | 1 262 |
| по авансам полученным | 632 | 28 | 26 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 297 | 1 831 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 220 | 220 |
| по оплате труда | 635 | 656 | 570 |
| по лизинговым платежам | 636 | 507 | 364 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 96 | 929 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **14 795** | **14 391** |
| **БАЛАНС** | **700** | **41 875** | **43 321** |

## ОТЧЕТ
## о прибылях и убытках
## за январь – март 2019 года

| **Наименование показателей** | **Код строки** | **За январь – март 2019 года** | **За январь – март 2018 года** |
|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 10 504 | 8 498 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (7 119) | (6 408) |
| Валовая прибыль | 030 | 3 385 | 2 090 |
| Управленческие расходы | 040 | (2 661) | (2 449) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 724 | (359) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 2 043 | 501 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (2 163) | (485) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 604 | (343) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 118 | 370 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 61 | 1 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 57 | 369 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (19) | (8) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (1) | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (18) | (8) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 1 182 | - |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 1 179 | |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 3 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 548) | (777) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (511) | (518) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (946) | (250) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (91) | (9) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (267) | (415) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 337 | (758) |
| Налог на прибыль | 160 | (142) | |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 195 | (758) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | | |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 195 | (758) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Маргун О.М.

Главный бухгалтер Будай О.В.

29 марта 2019 г.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-27447 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Мебель и техника в быту»), общей площадью 680,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422050400002002567, площадью 0,0984 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Мебель и техника в быту»), находящемся по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74

Начальная цена продажи – 160 000 руб. (сто шестьдесят тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 16 000 руб. (шестнадцать тысяч рублей)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 16 июля 2019 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.02.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 10 июля 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-21369 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – детский садик), общей площадью 276,7 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, Вселюбский с/с, а. г. Отминово, ул. Центральная, 48Л

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 424384404601000004, площадью 0,2872 га (назначение – земельный участок для размещения объектов образования и воспитания), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, Вселюбский с/с, а.г. Отминово, ул. Центральная, 48Л. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0163 га

Начальная цена продажи – 22 200 руб. (двадцать две тысячи двести рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 220 руб. (две тысячи двести двадцать рублей)

Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44-BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 30 июля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 24 июля 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация http://grodnoino.by*

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

Прачытаў — перадай другому *Сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і газеты «Звязда»*

# ЛЯСНАЯ ПРОЗА

## Што пісалі газеты пра будні партызан

*«Не трэба чакаць, пакуль наступіць выпадак для таго, каб сутыкнуцца з немцамі. Немцаў трэба шукаць і знаходзіць, знаходзіць і біць, біць усюды і ўсімі сродкамі, трымаць іх у стане паўсядзённага напружання, бесперапынку выматваць іх сілы...*

*Адсіжванне і чаканне роўна здрадзе. Нельга адсіжвацца і чакаць, калі вораг топча сваімі бруднымі нагамі нашу свяшчэнную зямлю, руйнуе і паліць нашы гарады і сёлы, тысячамі знішчае наша мірнае насельніцтва... Больш ініцыятывы і самастойнасці! Вышукваць новыя формы і метады барацьбы з ворагам, неадкладна іх прымяняць і ажыццяўляць, біць немцаў там, дзе яны гэтага не чакаюць, наносіць ім удары ў самыя адчувальныя месцы — вось баявыя задачы кожнага атрада»* — заклікала партызанская газета «Большэвік Палесся» ў чэрвені 1943 года.



Падрыўнікі.

### НЯЎЛОЎНЫ ПРАЦІЎНІК

Партызанскі рух стаў сапраўднай праблемай для нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За гады вайны партызаны і падпольшчыкі на беларускай зямлі знішчылі каля паўмільёна акупантаў, пусцілі пад адхон больш за 11 тысяч эшалонаў, разграмілі 948 варожых штабоў і гарнізонаў, знішчылі 1355 танкаў і бронемашын. Калі глядзець на дакументы савецкага ўраду, на загады і звароты Сталіна, якія друкаваліся ў газетах ваенных часоў, партызанскаму руху аддавалася асаблівая роля, народныя мсціўцы згадваліся побач з воінамі Чырвонай Арміі.




Як пусціць эшалон пад адхон?

Немцы былі не гатовыя да такога маштабнага народнага супраціўлення і не ведалі, як супрацьстаяць хітраму, трываламу, спрытнаму, няўлоўнаму праціўніку, які з'яўляецца знянацку, дзейнічае з засад і ўмешваецца ў раней спланаваныя аперацыі, у тыле здабывае інфармацыю пра іх ваенныя сілы і планы. У сакрэтнай брашуры «Аб вопыце дадзенай вайны» гаварылася: «Гэты рух быў для нас навіной; фанатызм, пагарда да смерці і ўпартасць, якую мы спаткалі ў народа ў рамках гэтага спосабу вядзення вайны, здзівіў нас, а велізарны размах прымянення гэтага метаду прывёў нас у жах». «Нельга адмаўляць, што гэтая барацьба каштуе нам вялікіх ахвяр, скоўвае частку нашых сіл і наносіць нам сур'ёзныя страты. Бальшавіцкія партызанскія атрады маюць добра арганізаваную і дасканала законспіраваную разведвальную сетку... Пад покрывам цёмнай ночы партызаны падпаўзаюць да чыгуначнага палатна, адвінчваюць рэйкі і закладваюць міны запаволенага дзеяння, а, калі чыгуначны састаў, нагружаны ваеннымі матэрыяламі або поўны нямецкіх салдат-адпускнікоў, ляціць пад адхон, яны кідаюць у вагоны ручныя гранаты, абстрэльваюць іх з аўтаматаў, а потым бясследна знікаюць, нібы ўтануўшы ў лясным гушчары.

Уздоўж прасёлачных дарог партызаны, схаваўшыся ў лісці дрэў, падпільноўваюць праезджыя аўтамашыны. Уначы яны знішчаюць вартавыя пасты, нападаюць на чыгуначныя будкі і раней, чым на месца здарэння прыязджае атрад, паспяваюць бясследна знікнуць.

У гэтых месцах заўсёды трэба быць напагатове. З абодвух бакоў дарогі і чыгуначнага палатна высякаецца лес на адлегласці 50—100 метраў для таго, каб лягчэй можна было агледзець мясцовасць», — пісала ў маі 1943 года фашысцкая газета «Дойчэ альгемайнэ цайтунг».



Партызаны пусцілі пад адхон варожы эшалон.

«Ахова камунікацый патрабуе ад немцаў вялікай сілы... Акупанты вымушаны трымаць усюды гарнізоны і няспынна ахоўваць усе ваенныя аб'екты, базы, склады, масты, чыгуначныя лініі, аэрадромы. Нідзе, апрача як у распалажэнні вялікіх гарнізонаў, немцы не могуць з'яўляцца па аднаму або невялікімі групамі. Для кожнай справы патрэбна ўзброеная ахова. Апрача таго, трэба вылучаць сур'ёзныя сілы для барацьбы з партызанскімі атрадамі... Зразумеўшы, якой велізарнай стратэгічнай сілай у руках савецкага ваеннага камандавання з'яўляюцца партызанскія атрады, нямецкія акупанты з вясны 1943 года правялі шырокія ваенныя дзеянні супраць партызан. У многіх месцах супраць партызан накіраваны не толькі шматлікія спецыяльныя часці, але і кадравыя пяхотныя дывізіі з прымяненнем танкаў, авіяцыі і артылерыі», — пісаў П. К. Панамарэнка ў брашуры «Партызанскі рух у Вялікай Айчыннай вайне».

Немцы нават спрабавалі скампраметаваць народных мсціўцаў, засылалі ў атрады сваіх агентаў, стваралі ілжэатрады, якія дзейнічалі пад выглядам партызан. Партызанская газета «Большэвіцкі сцяг» заклікала «рашуча выкрываць фашысцкіх правакатараў»: «Гітлераўскія майстры фальшывак пускаюць у ход усялякія правакацыі, каб толькі ачарніць партызан, абліць іх брудам, скампраметаваць іх сярод насельніцтва. З гэтай мэтай нямецкія акупанты дрэсіруюць, а потым імкнуцца засылаць у партызанскія атрады сваіх агентаў-правакатараў. У атрадах яны прыкідваюцца чэснымі партызанамі і ў той жа час займаюцца марадзёрствам, рабуюць і тэрарызуюць насельніцтва. Выкрываць гэтых нягоднікаў і распраўляцца з імі, як з правакатарамі, — непахісны закон партызанскага жыцця».

«Немцы і іх прыспешнікі на ўсіх перакрыжаваннях крычаць: «Сталінскія бандыты — здраднікі радзімы, як ваўкі хаваюцца па лясах і толькі ў цёмныя ночы з-за вугла грамяць мірных жыхароў, бо больш яны ні на што не здольныя. Бандыты тыя, хто, як дзікія звяры, налятае на вёскі Пагарэлае, Аміновічы, Уборкі, Зборск і пачынае агулам лавіць гусей, кур, вытрасаць з кватэр на машыны апошнюю вопратку мірных жыхароў; тыя, хто спаліў вёскі Суша і Усакіна, Чырвонае і Гумны; тыя, хто расстраляў дзясяткі соцень нявінных жыхароў. Гэта зрабілі і робяць фашысты і паліцэйскія», — 7 лістапада 1942 года дае абвяржэнне газета «Бобруйский партизан». — Тыя ж, якія штодзень пускаюць пад адхон эшалоны, разбураюць масты, вадакачкі і гарнізоны, культурна і ветліва гутараць з насельніцтвам, — не бандыты, а патрыёты, абаронцы сваёй Радзімы ад нашэсця гітлераўскіх бандаў». Газета паведамляе, што «дзесяткі тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, сотні тысяч машын, танкаў, самалётаў знішчылі партызаны-дыверсанты за час Айчыннай вайны... Абломкі варожых эшалонаў, пушчаных імі пад адхон, валяюцца на чыгунках Мінск — Бабруйск, Барысаў — Орша, Магілёў — Рагачоў».

## АЛЕЯ ВОІНСКАЙ СЛАВЫ Ў ГОНАР ДЭСАНТНІКАЎ

**У Мар'інай Горцы Пухавіцкага раёна на скрыжаванні вуліц Новая Зара і Іркуцка-Пінскай дывізіі ўрачыста адкрылі гісторыка-культурны комплекс «Алея воінскай славы».**

Комплекс створаны, як даніна памяці мінулым і цяперашнім абаронцам Айчыны. Цэнтральным элементам з'яўляецца помнік воінам 214-й паветрана-дэсантнай брыгады 4-га паветрана-дэсантнага корпуса, асабовы склад якога ў гады Вялікай Айчыннай вайны паказаў прыклады мужнасці і самаадданага служэння Радзіме. Воіны-дэсантнікі ў першыя дні вайны ўступілі ў схватку з ворагам, наносячы вялікі ўрон жывой сіле і тэхніцы, зрываючы планы праціўніка па маланкавым прасоўванні ўглыб савецкай краіны. Акрамя таго, на тэрыторыі комплексу ўстаноўлены ўзоры ваеннай тэхнікі, якая знаходзілася на ўзбраенні воінскіх часцей і злучэнняў, што дыслацыраваліся ў Пухавіцкім гарнізоне. А на памятных дошках размешчана інфармацыя аб воінскіх фарміраваннях, якія ў розныя часы знаходзіліся на Пухавіцкай зямлі.

Падчас праектавання і будаўніцтва комплексу многія арганізацыі і прадпрыемствы аказалі фінансавую і тэхнічную дапамогу. У прыватнасці, Пухавіцкі райвыканкам, ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь», Беларускі аўтамабільны завод і іншыя. Актыўны ўдзел і дапамогу ў будаўніцтве прынялі старшыня Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Прановіч, шэраг мясцовых прадпрыемстваў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Фестывалім

## У Магілёве паказалі

Учора Магілёў адзначыў Дзень горада і 75-годдзе свайго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Урачыстасці пачаліся з ускладання кветак і вянкоў да месцаў воінскіх пахаванняў, помнікаў і абеліскаў. У гэты ж дзень прайшлі шматлікія канцэртна-гульнявыя праграмы ў розных кутках абласнога цэнтра. А вечарам, калі сцямнела, на вялікай адкрытай пляцоўцы каля гандлёвага цэнтра «Е-сіці» на скрыжаванні праспекта Шміта і вуліцы Гагарына разгарнулася небывалае па памерах тэатралізаванае прадстаўленне з элементамі паказу гістарычных падзей «Салдатамі былі ўсе...». Такога маштабнага відовішча Магілёў яшчэ не бачыў. Танкі, самалёты, акопы — усё гэта было сапраўднае і натуральнае. У якасці кансультантаў выступалі адразу некалькі міністэрстваў — абароны, унутраных спраў і культуры. Якасную перадачу таго, што адбывалася на полі бітвы, забяспечвала кінастудыя «Беларусьфільм». Трансляцыя падзей вялася адначасова на шасці экранах.

У рэканструкцыі былі задзейнічаны ваенна-гістарычныя клубы, у тым ліку гісторыка-патрыятычнага пошукавага аб'яднання «Віккру», піратэхнічныя службы, авіяцыйны клуб, творчыя калектывы Магілёва. Гледачам дэманстравалі элементы паветранага бою, танкавай бітвы і баявых дзеянняў з выкарыстаннем піратэхнічных сродкаў. З гэтай мэтай было задзейнічана каля 30 адзінак авіяцыйнай і пяхотнай баявой тэхнікі. У тэатралізаваным шоу прыняло ўдзел больш за чатыры тысячы чалавек.

Трэба сказаць, што падрыхтоўка да прэм'еры была вельмі сур'ёзная і доўгая. Калі на полі за гандлёвым цэнтрам з'явілася дарожная тэхніка і сталі нешта рыць, жыхары бліжэйшых дамоў спачатку вырашылі, што распачынаецца будоўля. Але хутка ўбачылі, што ўсё абмежавалася стварэннем акопаў і траншэй. Так, новыя дамы з'явіліся, але выключна бутафорскія. Потым прывезлі танкі і гарматы. Пасля таго як пляцоўка была гатовая, пачаліся рэпетыцыі. Яны працягваліся некалькі месяцаў, і ўдзельнікі літаральна жылі на баявых пазіцыях.

Як паведаміла **начальнік упраўлення культуры Магілёўскага гарвыканкама Ірына ЖАБАРАВА**, пры правядзенні культурна-гістарычнага мерапрыемства былі выкарыстаны нестандартныя творчыя падыходы і формы.

Глядзельная зала ўяўляла сабой партэр пад адкрытым небам і працяглую паласу за гандлёвым цэнтрам. Асноўная частка мабільнага партэра была выдзелена для ўдзельнікаў адзінаццатага міжнароднага інвестыцыйнага форуму «Млын поспеху», які якраз у гэты дзень пачаў сваю работу ў Магілёве. Можна сказаць, што яшчэ каля 600 прадстаўнікоў дзелавых колаў з 20 краін свету далучыліся да святкавання Дня горада ў Магілёве.

Прадстаўленне скончылася святочным феерверкам «Квітней, Магілёў!» пад крыкі «Урррра!!!».

Сёння, 29 чэрвеня, гулянні працягваюцца. Самая старадаўняя вуліца Ленінская — або, як яе называлі ў розныя часы, Ветраная, Вялікая Садовая, Інжынерная — стала інтэрнацыянальнай.


НАБЛІЖАЕЦЦА ЧАС РАСПЛАТЫ

Зварот Якуба Коласа.

## РЭСПУБЛІКА-ПАРТЫЗАНКА

Партызанскія атрады пачалі стварацца з першых дзён вайны. Асабліва прырастаць шэрагі мсціўцаў сталі пасля першых перамог Чырвонай арміі. У лясы ваяваць сыходзілі цэлымі сем'ямі і вёскамі. Да канца 1943 года пад партызанскім кантролем знаходзілася ўжо 60 працэнтаў тэрыторыі рэспублікі.

«Зіма 1941—1942 гадоў выдалася снежная і марозная. Весці пазіцыйную вайну ў такіх умовах было для нас рызыкоўнай справай. Абкам партыі прымае рашэнне: здзейсніць рэйд партызанскіх атрадаў па раёнах Мінскай, Палескай і Пінскай абласцей, — згадваў Аляксандр Сакевіч — рэдактар газеты «Кліч Радзімы». — У нашым распараджэнні было каля 200 падвод. Калона магла расцягнуцца больш чым на два кіламетры. Таді вырашылі ехаць дзвюма паралельнымі калонамі. Перасоўваліся толькі ноччу. Здзейсніўшы кідок кіламетраў у трыццаць-сорак, займалі намечаны пункт і, расставіўшы пасты, кладліся адпачываць. Удзень праводзілі разведку і намячалі далейшы маршрут.

Чуткі пра наш марш з хуткасцю маланкі разносіліся па вёсках. Хутка народ загаварыў, што буйное злучэнне Савецкай Арміі перайшло лінію фронту і паспяхова вядзе баі з гітлераўцамі.

Чуткі дзейнічалі: многія невялікія гарнізоны разбягаліся яшчэ да нашага прыходу. Тых жа, хто яшчэ трымаўся, мы знішчалі. Так былі разгромлены нямецка-фашысцкія гарнізоны ў Доўгім, Скоўшыне, Вялічкавічах, Пасталах і іншых». Гэты рэйд працягваўся каля трох тыдняў. У яго была ўзята і партызанская тыпаграфія. Сялянкі сшылі невялічкія мяшэчкі з палатна, накшталт кісетаў для тытуню, у якія лясныя журналісты расклалі шрыфт. Падчас прывалаў, калі дазваляла абстаноўка, выпускаліся невялікія ўлёткі...

Дзякуючы прапагандысцкай рабоце, якой партызаны аддавалі вялікую ўвагу, зрываліся многія пачынанні акупацыйных улад. Мясцовае насельніцтва адмаўлялася плаціць падаткі, хавала прадукты, ухілялася ад прымусовай мабілізацыі, моладзь, каб не трапіць на катаргу ў Германію, сыходзіла ў лясы. Так, у першыя дні акупацыі гітлераўскія ўлады абвясцілі, што калгасы ператвараюцца ў «абшчынныя гаспадаркі», якія будуць уласнасцю завайёнікаў. Партызаны адразу ж выпусцілі ўлёткі, у якіх заклікалі не падпарадкоўвацца распараджэнням акупантаў. «Дзейснасць заклікаў перавышыла ўсе нашы чаканні: маленькія лісткі аказаліся мацней загадаў захопнікаў. Хлеб быў сабраны, абмалочаны, а амбары аказаліся пустымі. Па нашай жа парадзе калгаснікі разабралі з фермаў грамадскую жывёлу», — згадваў пасля вайны Іван Крыскавец, рэдактар падпольнай магілёўскай абласной газеты «За Радзіму».

У саміх атрадах праводзілася агітацыйная работа, падчас якой партызаны знаёміліся са зводкамі саўінфармбюро, поспехамі калег, калектыўна чыталі партызанскія газеты і прэсу, брашуры і кнігі, дастаўленыя з Вялікай зямлі. Партызаны праводзілі сходы і гутаркі ў вёсках. 25 красавіка 1943 года «Бальшэвік Палесся» дакладае: «Разгорнутую палітмасавую работу праводзіць сярод мірнага насельніцтва партызанскі атрад імя Варашылава. Атрад заваяваў славу сваімі баявымі поспехамі і правільна пастаўленай работай сярод насельніцтва. Партызаны не толькі чытаюць сялянам паведамленні саўінфармбюро, савецкія газеты і лістоўкі. Яны з моладдзю вывучаюць франтавыя песні, арганізоўваюць мастацкую самадзейнасць, дапамагаюць сялянам у палявых работах. Адсюль і бесперапынны рост атрада. За апошні месяц ён вырас у два разы».

Каб павысіць баяздольнасць партызанскіх атрадаў, асаблівая ўвага аддаецца рабоце з кадрамі. «Раней мы білі ворага галоўным чынам з засад. У апошні час нам прыйшлося сутыкацца з праціўнікам непасрэдна, лоб у лоб. Гэта нас прымусіла па-новаму пастаўць баявую вучобу ў атрадзе, арганізаваць яе ў адпаведнасці з набытым вопытам партызанскай барацьбы, — піша «Бальшэвік Палесся» 10 чэрвеня 1943 года. — У атрадзе ўведзена суровая рэгламентацыя дня... Усе байцы, вольныя ад баявых аперацый, штодзённа навучаюцца не менш 7 гадзін... Вучобу праводзіць камандны састаў, які ў сваёй большасці складаецца з франтавікоў і старых партызанаў...

Вялікую ўвагу мы аддаём таму, каб баец умеў выбіраць месца на полі боя, каб ён мог прымяніцца да любой абстаноўкі. Дабіваемся таго, каб кожны партызан валодаў разнастайнымі відамі айчыннай і трафейнай зброі, каб ён метка страляў і змог у любы час ліквідаваць магчымыя затрымкі ў стральбе».




Партызанская статыстыка.

Праводзяцца ў партызанскіх брыгадах і курсы медсясцёр, на якіх курсанты слухаюць лекцыі па спецыяльных прадметах, праходзяць адпаведную практыку і падрабязна вывучаюць, як абыходзіцца з вінтоўкай, аўтаматам, гранатай.

«Уцякаючы ад жандармскіх і паліцэйскіх пагромаў, у лесе апынулася маладое пакаленне — дзеці. Каб даць ім належнае выхаванне і навуку, камандаванне брыгады партызанскіх атрадаў 1-га чэрвеня адчыніла школу і выдзеліла настаўнікаў», — паведамляла газета «Барацьба» 19 чэрвеня 1944 года.

## НАСЕЛЬНІЦТВА ПАД АХОВАЙ

Перад партызанамі стаяла задача ратаваць насельніцтва ад знішчэння і ўгону ў Германію. «Абкам распрацаваў спецыяльнае мерапрыемства. Усе населеныя пункты вобласці былі размеркаваны паміж партызанскімі атрадамі і брыгадамі. Кожны атрад ведаў, якое сяло ён абараняе, куды вывозіцца насельніцтва ў выпадку небяспекі, клапаціўся пра стварэнне лясных лагераў. У лясах былі створаны запасы харчавання, — расказваў сакратар Мінскага падпольнага абкама КП(б) Б Васіль Казлоў. — Партызаны правялі многа баёў, абараняючы насельніцтва. Незадоўга да наступлення Чырвонай Арміі фашысты распачалі найбуйнейшыя за час вайны карныя аперацыі супраць раёнаў, дзе сканцэнтраваны партызанскія атрады. Насельніцтва, выратоўваючыся ад зверстваў, ад угону ў рабства, масамі ішло ў лясы, уступала ў партызанскія атрады, уключалася ў актыўную барацьбу супраць гітлераўцаў.

Сваімі баявымі дзеяннямі партызаны вобласці вывелі з гарадоў і вёсак і выратавалі каля 567 тысяч чалавек мірнага насельніцтва». Такія ж меры прымаліся і ў іншых абласцях Беларусі.

Газеты расказваюць, як партызаны вызваляюць «наверабаваную моладзь» і замежных нявольнікаў, прывезеных сюды на прымусовую працу. Мсціўцы ахоўваюць палі падчас сяўбы і збору ўраджаю, часта самі дапамагаюць на палявых работах, выдзяляюць коней. «Бальшэвік Палесся» 2 верасня 1943 года расказвае пра сапраўдны бой на полі: немцы, якія спрабавалі забраць збожжа на полі Глускага раёна, атрымалі сур'ёзны адпор з боку народных мсціўцаў. Двое сутак вялася перастрэлка з ворагам, партызанам нават давялося прыгнаць сюды свой танк.

Пры адступленні акупанты рабуюць і паляць вёскі (для гэтай мэты немцамі нават былі створаны спецыяльныя брыгады), і ў газетах можна знайсці багата нататак пра тое, як партызанам удалося спыніць ворага і патушыць пажары, вярнуць нарабаванае сялянам.

## ВЫЗВАЛЕННЕ

Кіраўніцтва баявымі дзеяннямі партызанскіх брыгад і атрадаў, арганізацыю іх непасрэднага ўзаемадзеяння з войскамі Чырвонай Арміі здзяйснялі аператыўныя групы Беларускага штаба партызанскага руху, прыкамандзіраваныя да ваенных саветаў франтоў. Яны займаліся забеспячэннем партызан зброяй і боепрыпасамі, адпрацоўвалі і перадавалі разведданыя камандаванню франтоў, распрацоўвалі і ставілі кожнаму партызанскаму злучэнню баявыя задачы.

Асобая роля аддавалася партызанам у аперацыі «Баграціён». Беларускія партызаны перад пачаткам аперацыі з 20 па 23 чэрвеня правялі масавае разбурэнне чыгуначных дарог і паралізавалі рух на чыгунках у тылу ворага. Кантралявалі партызаны і грунтовыя, і шасэйныя дарогі, знішчалі тэлефонна-тэлеграфную сувязь. Разам з воінамі Чырвонай арміі вызвалялі населеныя пункты, а таксама дапамаглі танкаваму корпусу здзейсніць імклівае прасоўванне па лясіста-балоцістай мясцовасці і нечакана напасці на ворага. «Усе дарогі і прасекі... былі замініраваны, завалы расчышчаны. Партызаны і мясцовыя жыхары ўмела арудавалі рыдлёўкамі, сякерамі, умацоўвалі балоцістыя месцы. І гэта на ўсёй працягласці ад Бярэзіны да Смалявіч!» — згадваў генерал-лейтэнант танкавых войскаў А. Бурдзейны.

Пасля вызвалення Беларусі 180 тысяч народных мсціўцаў уступілі ў Чырвоную армію, многія партызаны занялі кіруючыя пасады і аднаўлялі разбураныя гарады і вёскі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# чэрвень 44-га

Так выглядала поле бітвы за дзень да «бою».



Свае падворкі выставілі ўкраінская, азербайджанская, руская, яўрэйская, польская, грузінская, армянская дыяспары. Яны запрашалі да сябе выстаўкамі карцін, кніг, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. А яшчэ дэманстравалі свае танцы і спевы, звычкі і традыцыі. Беларускі падворак прадставілі народная студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Чараўніцы», грамадскае аб'яднанне магілёўскіх рамеснікаў «Шчырая майстэрня», Магілёўская фабрыка мастацкіх вырабаў і дзіцячая школа мастацтваў.

Настрой на Ленінскай ствараюць мастакі-шаржысты, клоўны і «жывыя скульптуры» — іх удзел забяспечвае інтэрактыўная пляцоўка «Маладзёжны рэтра-бум». Сёння ў праграме таксама ўрачыстая цырымонія ўручэння штогадовай спецыяльнай прэміі Магілёўскага гарвыканкама «Дасягненне», велакарнавал «Табе, любімы горад на Дняпры», лёгкаатлетычны прабег «Дарога да шчасця», тэатралізаванае шэсце «Усім сэрцам з табой, мой горад родны!», свята «Магілёў гасцінна запрашае!» з праграмай «Мой родны кут» і выставачна-кірмашовай экспазіцыяй «Магілёўшчына майстравая» і шмат чаго іншага не менш цікавага. Удзел у святочных мерапрыемствах у Магілёве прымае губернатарскі духавы аркестр Тульскай абласной філармоніі імя І. Міхайлоўскага.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

# ЗМАГАЎСЯ ЗА ВАРШАВУ, ШТУРМАВАЎ БЕРЛІН

**Юбілейны медаль «75 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» уручыў у Валожыне ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміру Шаблыку старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка.**

Уладзімір Антонавіч нарадзіўся 14 лютага 1925 года на Мядзельшчыне ў шматдзетнай сям'і. «Калі пачалася вайна, дапамагаў бацьку, які быў сувязным у партызанскім атрадзе. У 1944-м мяне прызвалі ў армію. Службу пачынаў у Волгадзе. Планавалася адпраўка ў Варшаву, але нававбранцы апынуліся ў Мурманску. Пад самым горадам эшалон разбамбілі нямецкія самалёты. Ні да гэтага, ні пасля мне не было так страшна», — прызнаўся ветэран. Затым была служба ў Фінляндыі, дзе салдат сустрэў Перамогу.

Пасля вайны Уладзімір Антонавіч закончыў тэхнікум, ажаніўся. Пасля атрымання дыплома быў накіраваны на работу на Валожынскі масларабзавод.

Уладзімір Шаблыка вядомы яшчэ і тым, што да нядаўняга часу, нягледзячы на ўзрост, прымаў актыўны ўдзел у лыжных спаборніцтвах, абараняючы спартыўны гонар свайго роднага прадпрыемства. Ветэран вайны і працы ганарыцца тым, што кіраўніцтва і калектыў малочнага камбіната не забываюць пра яго. Нястомны працаўнік, ён і сёння паспявае ўсюды — падтрымліваць утульнасць і чысціню ў доме, даглядзець агарод.

Аналагічны медаль атрымаў з рук памочніка Прэзідэнта — інспектара па Мінскай вобласці Ігара Яўсеева і жыхар Маладзечна Віталь Закаблук.

Віталь Канстанцінавіч нарадзіўся 15 снежня 1925 года. У гады вайны служыў у дзеючай арміі, ваяваў на I Беларускім фронце. Пехацінец, вызваляў Варшаву, штурмаваў Берлін. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», удзельнік парада ў Маскве 1945 года.

Усяго ў Мінскай вобласці юбілейны медаль атрымае каля 2,5 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і вязняў фашысцкіх канцлагераў. Матэрыяльная дапамога выплачана амаль 2500 ветэранам Вялікай Айчыннай і прыраўнаваным да іх асобам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13 |

**Предмет аукциона**
**Недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Брест, ул. Гоздецкого, 26**

| Лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Производственная база** (здание административно-хозяйственное) | 426,6 кв. м | 100/С-59114 |
| | **Автогараж** (здание специализированное автомобильного транспорта)<br>Составные части и принадлежности: навес, площадка с асфальтобетонным покрытием, бетонная дорожка, ограждение из металлической сетки, ограждение железобетонное, ворота, калитка, ворота | 98,9 кв. м | 100/С-59115 |

В состав лота входит следующее имущество: теплосчетчик ТЭМ-05М-1dy25, электротельфер, баллон пропановый, контейнер для инвентаря, лебедка ЛР-1.6, металлический бак для воды, монитор «Samsung» ЖК 19, набор головок 1/2 8-32, пожарный щит с ящиком для песка, принтер HP Laser P 1102, ПЭВМ «Формоза», реостат балластный РБ-302 (3 шт.), стол компьютерный, стол письменный, шкаф учета электроэнергии

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,3020 га для обслуживания Брестского нехозрасчетного ремонтного участка

**Начальная цена с НДС 20 % – 273 977,07 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 13 699,85 бел. руб.**

Порядок ознакомления: в рабочие дни с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Каминский Павел Иванович, ликвидатор, тел. 8 029 659-14-39, Драка Евгений Николаевич, тел. 8 029 574-00-68

**Оборудование, транспортные средства, расположенные по адресу: г. Минск, Бетонный проезд, 11**

| лот п/п | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска / дата принятия к бух. учету | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 21763 | Вышка «Атлант» | 814,80 | 40,74 |
| 2 | 2423 | Пила маятниковая | 697,20 | 34,86 |
| 3 | 1518 | Пила маятниковая | 462,00 | 23,10 |
| 4 | 21470 | Сварочный полуавтомат ПДГ-503.4 | 1 512,00 | 75,60 |
| 5 | 21496 | Автокран MAZ 5337-KS 35715 (рег. знак КН0024), 2004 г. в. | 22 764,00 | 1 138,20 |
| 6 | 998 | Автопогрузчик ДВ 1792.33, 2006 г. в. | 4 452,00 | 222,60 |
| 7 | T00A5171 | Автомобиль МАЗ 5336 А5-320, 2008 г. в. | 4 704,00 | 235,20 |
| 8 | T00A5223 | Прицеп МАЗ-892600, 2008 г. в. | 1 092,00 | 54,60 |
| **Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Машинистов, 80** | | | | |
| 9 | T0000051 | Бытовка 6х2,4х2 | 789,60 | 39,48 |
| 10 | T00A5124 | Бытовое помещение № 3 | 1 344,00 | 67,20 |
| 11 | T0007135 | Вагончик | 924,00 | 46,20 |
| 12 | T0005055 | Металлический склад № 1 | 554,40 | 27,72 |
| 13 | T0005057 | Металлический склад № 3 | 554,40 | 27,72 |
| 14 | T00A5118 | Блок-модуль на шасси М-К-3-06-МСТ | 2 184,00 | 109,20 |
| 15 | T00A5126 | Бытовой блок модуль на шасси 2,35х5,40 | 1 344,00 | 67,20 |
| 16 | T00A5125 | Бытовой блок модуль на шасси 2,35х5,40 | 1 344,00 | 67,20 |
| 17 | T00A5131 | Генератор бензиновый сварочный ESE 604 SDHS/DC | 621,60 | 31,08 |
| 18 | T00A5152 | Погрузочная воронка с секциями L1м | 798,00 | 39,90 |
| 19 | T00A5163 | Сварочный аппарат для полимерных труб PW-1500, 1500 Вт | 65,52 | 3,28 |
| 20 | T00A5162 | Сварочный аппарат для полимерных труб PW-1500, 1500 Вт | 65,52 | 3,28 |
| 21 | 5000 | Станок заточный 3К 634 | 495,60 | 24,78 |
| 22 | T00A5220 | Полуавтомат сварочный KIT 305 | 1 932,00 | 96,60 |

Порядок ознакомления: в рабочие дни с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00 Рудович Виктор Андреевич, тел. 8 029 647-94-47

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: по лоту № 1 не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. По лотам №№ 2–22 не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 07.06.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | 18.07.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, Бетонный проезд, 17, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | 15.07.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона и его местонахождение** | **Лот № 1** – здание бывшего сельского клуба с принадлежностями по ул. Кутузова, 2А в д. Малая Лапеница Волковысского района |
| **Начальная цена предмета аукциона** | 6 752 рубля 80 копеек; размер задатка – 680 руб. |
| **Продавец недвижимого имущества** | Отдел культуры Волковысского райисполкома. Тел.: 8 (01512) 4 51 74, 4 50 25 |
| **Характеристика объектов**  | **Капстроение с инв. № 410/С-23341** (**сельский клуб** (инв. № 01010059) – 1958 г. п., 1-й этаж, S общ. – 121,8 кв. м, с кирпичной пристройкой, перекрытия и полы – дерево, стены – брус, кровля – а/ц волнистый лист, отопление – печи; **сарай** (инв. № 01010088) – дощатый, S застр. – 14 кв. м, кровля – а/ц волнистый лист; **дорожка** (инв. № 01100089) – бетон, 15,0 кв. м; **дорожка** (инв. № 01100090) – асфальтобетон, 50,0 кв. м; **воздушная линия электропередачи** (инв. № 01200020) – кабель АВВГ 2х6, L – 5 м). **Многолетние насаждения**** (01910024/2-01910024/4) – 15 шт. (береза, каштан, липа) |
| **Информация о земельном участке** | Срок аренды земельных участков площадью (под застройкой): 0,0952 га и 0,0054 га – по 1 марта 2069 г. |
| **Ограничения по использованию земельных участков** | **По лоту № 1:** на участке 0,0952 га – водоохранная зона водного объекта площадью 0,0952 га и охранная линия электропередачи до 1000 вольт площадью 0,0117 га; на участке 0,0054 га – водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос площадью 0,0054 га |

Организатор аукциона: комитет «Гроднооблимущество». Аукцион состоится **11 июля 2019 года в 11.30** по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **5 июля 2019 года до 17.00.**
Контактные телефоны: 8 (0152) 72 25 18; 72 21 02. Сайты: http://www.region.grodno.by; http://www.gki.gov.by

Условия продажи недвижимого имущества: использование приобретенного объекта под цели, не противоречащие законодательству Республики Беларусь, начало использования – не позднее 3 лет с даты заключения договора купли-продажи

Условия использования земельных участков: в установленном порядке использовать земельные участки для размещения: объектов здравоохранения и социального обеспечения, торгово-бытовых объектов, административно-деловых учреждений, молодежных культурно-досуговых центров, физкультурно-оздоровительных центров, складских сооружений **(лот № 1)**; объектов первичного пользования (приемные пункты, мастерские по ремонту обуви, парикмахерские, бани, жилищно-эксплуатационные службы), под жилое помещение **(лот № 2);** получение архитектурно-планировочного задания и технических условий для инженерно-технического обеспечения объекта строительства разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и строительство или получение решения Волковысского РИК об изменении назначения недвижимого имущества без проведения строительно-монтажных работ (в случае изменения назначения недвижимого имущества, реализуемого на аукционе); осуществление строительства, реконструкции объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. **Покупателю имущества в установленном порядке может быть предоставлена рассрочка оплаты приобретенного имущества**

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона и его местонахождение** | **Лот № 2** – здание бывшего клуба-библиотеки с принадлежностями в д. Родники, 18А, Волковысского района |
| **Начальная цена предмета аукциона** | 8 744 рубля 30 копеек; размер задатка – 880 руб. |
| **Продавец недвижимого имущества** | Отдел культуры Волковысского райисполкома. Тел.: 8 (01512) 4 51 74, 4 50 25 |
| **Характеристика объектов**  | **Капстроение с инв. № 410/С-22483 (клуб-библиотека** (инв. № 01010062) – 1936 г. п., 1 этаж, S общ. – 152,2 кв. м, с двумя холодными пристройками из кирпича, перекрытия – дерево, стены – брус обложен кирпичом, кровля шиферная, отопление печное; **сарай** (инв. № 01010086) – дощатый, S застр. – 36,0 кв. м, **кровля** – шифер; **уборная** (инв. № 01000104) – дощатая, S застр. – 3,0 кв. м, кровля шифер; **тротуар** (инв. № 01100093) – цементно-бетонная плитка, 28,0 кв. м; **забор** (инв. № 01100094) – деревянный на ж/б столбах, L – 28,2 м; **воздушная линия электропередачи** (инв. № 01200023) – кабель АВВГ 2х6, L – 2,5 м). **Многолетние насаждения**** (01910030/1-01910030/5) – 11 шт. (верба, береза, ясень, ель, туя) |
| **Информация о земельном участке** | Срок аренды земельного участка площадью (под застройкой) 0,1822 га – по 1 марта 2069 г. |

Организатор аукциона: комитет «Гроднооблимущество». Аукцион состоится 11 июля 2019 года в 11.30 по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 5 июля 2019 года до 17.00.
Контактные телефоны: 8 (0152) 72 25 18; 72 21 02. Сайты: http://www.region.grodno.by; http://www.gki.gov.by

Условия продажи недвижимого имущества: использование приобретенного объекта под цели, не противоречащие законодательству Республики Беларусь, начало использования – не позднее 3 лет с даты заключения договора купли-продажи

Условия использования земельных участков: в установленном порядке использовать земельные участки для размещения: объектов здравоохранения и социального обеспечения, торгово-бытовых объектов, административно-деловых учреждений, молодежных культурно-досуговых центров, физкультурно-оздоровительных центров, складских сооружений **(лот № 1)**; объектов первичного пользования (приемные пункты, мастерские по ремонту обуви, парикмахерские, бани, жилищно-эксплуатационные службы), под жилое помещение **(лот № 2)**; получение архитектурно-планировочного задания и технических условий для инженерно-технического обеспечения объекта строительства разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и строительство или получение решения Волковысского РИК об изменении назначения недвижимого имущества без проведения строительно-монтажных работ (в случае изменения назначения недвижимого имущества, реализуемого на аукционе); осуществление строительства, реконструкции объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. **Покупателю имущества в установленном порядке может быть предоставлена рассрочка оплаты приобретенного имущества**

---

## Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» уведомляет, что в извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объектов в г. Гродно 23 июля 2019 года внесены изменения

Строку 4 таблицы следует читать в следующем виде:

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4* | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | ул. Суворова (въезд Рамесны) | 0,7821 | 440100000001008998 | 39 575,52 | 3 957,55 | 3 020,60 | Строительство объекта производственного назначения – производство продуктов питания (производственное здание со вспомогательными помещениями, со встроенными или отдельно стоящим административно-бытовым корпусом, встроенными или отдельно стоящими технологическими сооружениями) |

УНП 590727594

---

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4 |

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование | Общая площадь, год выпуска | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| **1** | Торговый павильон, металл. 10*4*3 м (с охранной сигнализацией) | 40 кв. м, 2010 г. в. | 13001000003 | **8 419,28 бел. руб.** |
| **2** | Торговый павильон, металл. 10*4*3 м (с охранной сигнализацией) | 40 кв. м, 2011 г. в. | 13001000005; 09040000082 | **11 288,35 бел. руб.** |
| **3** | Торговый павильон металл. 10*4*3 м (с охранной сигнализацией) | 40 кв. м, 2011 г. в. | 13001000008; 02941000038 | **9 391,21 бел. руб.** |
| **4** | Торговый павильон, металл. 10*4*3 м (с охранной сигнализацией) | 40 кв. м, 2010 г. в. | 13002000004; 09040000002 | **7 932,86 бел. руб.** |
| Место нахождения лотов: г. Бобруйск, Минское шоссе (автостоянка возле проходной СКГШ) | | | | |
| **5** | Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома) | – | 730/U-16808 | **33 248,43 бел. руб.** |
| **Место нахождения лота: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Мельникова, 5** | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** земельный участок площадью **0,2203 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | | | | |
| **6** | Здание заводоуправления | 2 935,2 кв. м | 730/С-12820 | **677 114,80 бел. руб.** |
| **Составные части и принадлежности:** подъездная дорога (инв. № 730/С-17065); ограждение (инв. № 730/С-17063); ограждение (инв. № 730/С-17062); участок канализации (инв. № 730/С-17062); ввод водопровода (инв. № 730/С-17061). | | | | |
| **Место нахождения лота: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А** | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** земельный участок площадью **1,0277 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания заводоуправления | | | | |
| **7** | Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание административно-хозяйственное) | 7 458 кв. м | 730/U-15754 | **2 712 327,01 бел. руб.** |
| **Место нахождения лота: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1/1** | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** земельный участок площадью **0,3478 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения; земельный участок площадью **0,0005 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения; земельный участок площадью **0,0005 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения | | | | |

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **31.07.2019** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **29.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

# КАРОНА З КІШЭНЯЙ

## У колькі брытанцам абыходзіцца манархія?



**Днямі ў Вялікабрытаніі была агучана справаздача каралеўскага двара, з якой вынікае, што манархія атрымала з казны за мінулы фінансавы год больш за 80 мільёнаў фунтаў (каля 100 мільёнаў долараў). Пры гэтым стала вядома, што каля 40 працэнтаў ад унушальнай сумы пойдзе на рамонт у лонданскай рэзідэнцыі каралевы — Букінгемскім палацы, перадае Бі-бі-сі. Каштарыс работ у Фрогмар-катэджы герцага і герцагіні Сасэкскіх больш «сціплы» — 2,4 мільёна фунтаў за год. Рэспубліканцы абураюцца: дзяржава эканоміць на грамадзянах, зразае сацыяльныя выдаткі, а манаршая субсідыя год ад года толькі павялічваецца. Іх праціўнікі запэўніваюць, што каралеўскі двор не марнуе ні капейкі з грошай падаткаплацельшчыкаў і да таго ж прыносіць даход — як прамы грашовы, так і ўскосны эканамічны. У колькі ж абыходзіцца манархія брытанцам?**



### ІМПЕРЫЯ НЕРУХОМАСЦІ

У каралеўскай сям'і два фінансавыя цэнтры: каралева Лізавета II і прынц Валійскі Чарльз. Выдаткі каралевы вышэйшыя, але менавіта яна атрымлівае грант з бюджэту. А яе старэйшы сын па традыцыі, якой амаль 700 гадоў, існуе на даход ад зямель і нерухомасці, сабраных у своеасаблівы інвестыцыйны фонд — герцагства Корнуал. Летась гэтыя актывы прынеслі яму каля 20 мільёнаў фунтаў. З той часткі даходу, якую прынц Чарльз траціць на асабістыя патрэбы, ён добраахвотна плаціць падатак, а фінансавую справаздачу штогод адпраўляе ў парламент і публікуе ў інтэрнэце. З гэтых жа грошай ён аплачвае прадстаўнічыя функцыі — свае і малодшых пакаленняў: прынца Уільяма і яго жонкі Кейт, герцага і герцагіні Кембрыджскіх, а таксама прынца Гары і Меган, герцага і герцагіні Сасэкскіх.



У каралевы таксама ёсць уладанні, якія прыносяць прыбытак. Яны адносна сціплыя па мясцовых мерках: у спісе брытанскіх багацеяў газета Sunday Times змясціла яе на 356-е месца, ацаніўшы капітал у 370 мільёнаў фунтаў. Меншая частка ўладанняў каралевы — яе ўласнасць: замак Балморал у Шатландыі, Сандрынгемскі палац у англійскім Норфалку і герцагства Ланкастэрскае, якое прыносіць ёй прыкладна столькі ж, колькі герцагства Корнуал яе старэйшаму сыну, — каля 20 мільёнаў фунтаў у год.

А большая частка каралеўскіх актываў сабрана ў так званыя Уладанні кароны (Crown Estate). Гэта імперыя нерухомасці і зямель коштам больш за 14 мільярдаў фунтаў, якая належыць манарху, але кіруецца ў інтарэсах падданых. У яе ўваходзяць, напрыклад, дзясяткі будынкаў у самым цэнтры Лондана, у тым ліку ўся парадная Рыджэнт-стрыт, рытэйл-паркі і гандлёвыя цэнтры ў правінцыі і нават значныя ўчасткі марскога дна на шэльфе Англіі, Уэльса і Паўночнай Ірландыі, якія двор здае ў арэнду пад фермы ветракоў, кабелі і трубаправоды.

### ЗАЛАТОЕ ДНО

Брытанская каралеўская сям'я здолела зарабіць летась рэкордныя £343,5 мільёна. Пра гэта паведаміла газета Financial Times са спасылкай на звесткі кампаніі Crown Estate, якая кіруе ўласнасцю манархічнага дома ў асобе каралевы Вялікабрытаніі Лізаветы II. Згодна з інфармацыяй кампаніі, якая кантралюе зямлю і ўласнасць суверэна, кошт гэтай нерухомасці вырас у мегаполісе толькі на 1,7 працэнта — да £14,3 мільярда. Гэта самы нізкі паказчык з 2009 года. За межамі Лондана кошт уладанняў манаршага дома нават абваліўся на сем працэнтаў.

Аднак вырашальны ўплыў на канчатковыя вынікі летась аказаў рэзкі рост кошту энергетычнага і інфраструктурнага складнікаў каралеўскага партфеля, які павялічыўся на 14 працэнтаў, — да больш чым £1,6 мільярда. Марское дно насамрэч аказалася залатым — па словах выканаўчага дырэктара Crown Estate Элісан Німна, «энергетычныя магчымасці шэльфа маюць вялікі патэнцыял». Кампанія раней запусціла праграму па развіцці «зялёнай» энергіі з выкарыстаннем ветру, марскіх хваляў, прыліваў і адліваў. Як адзначае Financial Times, за апошнія 10 гадоў кошт партфеля каралеўскай кампаніі нерухомасці значна вырас, што прынесла дзяржаве агульны прыбытак у £2,8 мільярда.

### ЧАС РЭНАВАЦЫЙ

Сотні мільёнаў фунтаў штогод у поўным аб'ёме пералічваюцца ў бюджэт. З гэтых грошай урад і вылучае каралеўскай сям'і субсідыю. Памер гранта перагледаецца кожныя пяць гадоў. Раней ён складаў 15 працэнтаў даходаў Crown Estate, але летась быў павялічаны да 25 працэнтаў з умовай, што ў бліжэйшыя 10 гадоў на дадатковыя паступленні будзе адрамантаваны Букінгемскі палац. На гэта патрабуецца амаль 400 мільёнаў фунтаў. Як вядома, Букінгемскі палац быў пабудаваны ў 1703 годзе як прыватная рэзідэнцыя, а палацам стаў толькі ў 1761-м, калі яго набыў кароль Георг III. Усходняе крыло было дабудавана да яго ў часы праўлення Вікторыі, а ў 1914 годзе, пры Георгу V, дзядулі цяперашняй каралевы, фасад быў абліцаваны трывалым портлендскім каменем.

Каралеве Лізавеце II у 2025 годзе давядзецца пакінуць свае пакоі ў Букінгемскім палацы. Падчас рэнавацыі будзе цалкам заменена электраправодка, якая ў любы момант можа стаць крыніцай пажару, а таксама сістэма ацяплення, якая пагражае палацу патопам. Уласна кажучы, работы па добраўпарадкаванні Букінгемскага палаца ўжо праводзяцца, прадстаўнік каралевы афіцыйна абвясціў аб тэрмінах рамонту — яго плануецца завяршыць да 2027 года.

Рэнавацыя будзе весціся такім чынам, каб як мага менш парушаць уклад жыцця каралевы і яе мужа прынца Філіпа. І ўсё ж у 2025-м ім давядзецца на пару гадоў пакінуць свае апартаменты ў паўночным крыле палаца. «Каралева — надзвычай прагматычная жанчына, і яна хоча як мага даўжэй заставацца ў палацы, — паведаміў журналістам на ўмовах ананімнасці адзін з высокапастаўленых прыдворных. — Яна сама сказала: паведаміце, калі захочаце, каб я з'ехала».

Загарадная рэзідэнцыя герцага і герцагіні Сасэкскіх Фрогмар-катэдж знаходзіцца за кіламетры ад Віндзорскага замка. Раней яна была разбіта на пяць кватэр, дзе жыла каралеўская прыслуга. Фрогмар-катэдж з'яўляецца часткай вялікага маёнтка Фрогмар-хаўс, дзе Гары і Меган прымалі гасцей з нагоды свайго шлюбу ў маі мінулага года. Дом быў пабудаваны ў 1801-м, каралева Лізавета II падарыла яго маладой пары пасля вяселля. Падчас рамонту Фрогмар-катэдж давялося перарабіць у жыллё для адной сям'і. Прынц Гары і яго жонка Меган спачатку жылі ў Кенсінгтонскім палацы. Яны пераехалі ў катэдж у красавіку, незадоўга да нараджэння сына Арчы. Гары і Меган з уласнай кішэні аплацілі ўстаноўку новых водаправодных труб і кранаў.

Вядома, што ў асабняку ў ходзе рамонту замянілі драўляныя столевыя бэлькі, перакрыцці і састарэлую сістэму ацяплення. Акрамя таго, у дом правялі газ і замянілі электраправодку. Агулам рамонтныя работы занялі паўгода. У некаторых памяшканнях яны яшчэ працягваюцца. «Гэты дом не рамантаваўся доўгія гады і ўжо стаяў у чарзе на рамонт у адпаведнасці з нашымі абавязацельствамі па падтрыманні здавальняючага стану каралеўскіх рэзідэнцый», — паведаміў захавальнік асабістага кашалька манарха сэр Майкл Стывенс. Герцаг і герцагіня Кембрыджскія таксама рамантавалі сваё будучае жыллё, перад тым як выехаць з Кенсінгтонскага палаца, і выдаткавалі тады значную суму — чатыры мільёны фунтаў — на перабудову офіснага будынка ў жылы дом.

### ШЛЮБ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

Кансалтынгавая кампанія Brand Finance мяркуе, што дзякуючы цікавасці, якую выклікае ў публікі каралеўская сям'я, нацыянальны прадукт Вялікабрытаніі штогод павялічваецца на 1,5 мільярда фунтаў. Аднак пры гэтым варта мець на ўвазе тое, што памер брытанскай эканомікі летась перавысіў 2,2 трыльёна фунтаў. Больш за трэць ускоснай падтрымкі — звыш 500 мільёнаў фунтаў — прыпадае на турыстычную галіну, мяркуе Brand Finance. Аналагічныя ацэнкі некалькі гадоў таму давала агенцтва VisitLondon, якое займаецца прасоўваннем турызму ў брытанскай сталіцы. Эксперты вызначалі даходы ад наведвання славутасцяў, звязаных з манархіяй, і падлічвалі, колькі замежных гасцей прыязджае ў Вялікабрытанію толькі таму, што на чале краіны стаіць каралева.



Дарэчы, і ўласна члены каралеўскай сям'і актыўна перамяшчаюцца па свеце, пра што сведчыць іх справаздача аб дарожных выдатках. Агульны бюджэт паездак летась склаў 2,7 мільёна фунтаў стэрлінгаў. Палову гэтай сумы склалі выдаткі прынца Чарльза. Пра гэта паведаміла Teleprogramma.pro са спасылкай на Express. Транспартныя выдаткі прынца Чарльза за апошні год выраслі з 1,2 мільёна фунтаў да 1,33 мільёна фунтаў. Найбольш прывабнымі для яго аказаліся цягнікі, кожная з паездак на якіх ацэньваецца ў 20 тысяч фунтаў. У 414 тысяч фунтаў абышоўся падаткаплацельшчыкам тур прынца Чарльза з жонкай на Карыбы і Кубу. Кошт іх падарожжа ў Заходнюю Афрыку склаў 216 тысяч фунтаў.

Як лічаць эксперты, акрамя турызму ў выйгрышы і іншыя галіны брытанскай эканомікі, асабліва ў гады, калі ў каралеўскай сям'і ўрачыстасці: юбілеі, вяселлі і нараджэнне спадчыннікаў. Пасля вяселля прынца Уільяма і Кейт іх прыхільнікі накуплялі сувеніраў ажно на 200 мільёнаў фунтаў, падлічыў Centre for Retail Research. А з нараджэннем кожнага з трох дзяцей — яшчэ як мінімум на 50 мільёнаў. Кубкі, футболкі і печыва з партрэтамі другой каралеўскай пары — прынца Гары і Меган — разышліся таксама ўнушальным накладам. Brand Finance перад іх леташнім вяселлем ацэньвала продаж мемарабіліі ў 50 мільёнаў фунтаў, дадатковыя даходы турыстычнай галіны — у 300 мільёнаў, а рэстаранаў і крамаў — яшчэ ў 250 мільёнаў фунтаў.

Крытыкі ўпэўнены, што ўсе гэтыя грошы былі б выдаткаваныя ў любым выпадку, проста на іншае. Так, кажуць яны, у месяц вяселля паток турыстаў павялічыўся, аднак да і пасля — скараціўся, а значыць, замежнікі проста масава падгадалі візіт да свята. Аднак вынік у наяўнасці: упершыню за доўгі час каралеўская сям'я трапіла ў традыцыйна сумныя справаздачы цэнтрабанка і статыстычнага ведамства. Год таму яны назвалі каралеўскі шлюб адным з трох фактараў аднаўлення квартальнага росту брытанскай эканомікі — нароўні з незвычайна гарачым надвор'ем і ўдалым выступленнем англійскай зборнай на чэмпіянаце свету па футболе.

Брытанская манархія — папулярны ў свеце брэнд, і, як любыя знакамітасці, члены каралеўскай сям'і служаць надзейным рухавіком спажывання, упэўнена Бі-бі-сі. І яно не ведае межаў. Жыццю брытанскага двара ў гады кіравання Лізаветы II прысвечаны самы дарагі серыял у гісторыі: амерыканскі Netflix выдаткаваў 140 мільёнаў долараў на здымкі першага сезона «Кароны», а ўсяго іх плануецца шэсць. Здымалі яго большай часткай у Англіі. Выходзіць, каралеўскі двор зноў падтрымаў брытанскую эканоміку. На гэты раз амерыканскімі грашыма.

**Захар БУРАК.**

Асоба

# Павел ЛАТУШКА: «Сёняшні глядач сапраўднае

**У ЖО некалькі месяцаў Купалаўскі тэатр працуе пад кіраўніцтвам Паўла Латушкі — вядомага дыпламата і прыхільніка беларускай культуры. Да таго як стаць генеральным дырэктарам тэатра, ён пабываў на пасадах пасла Беларусі ў Польшчы, міністра культуры і, нарэшце, пасла Беларусі ў Францыі (па сумяшчальніцтве Іспаніі, Партугаліі і Манака). Адзін з самых «гучных» у сферы культуры дыпламат цяпер займаецца будучыняй Купалаўскага, а нам расказвае пра планы тэатра, найлепшую падзею ў Францыі і беларускае кіно.**

***— Ужо асвойталіся на новым месцы?***

— З улікам таго, што я некалькі гадоў займаўся сферай культуры на радзіме і быў датычны да яе падчас дыпламатычнай работы, прызначэнне кіраўніком адной з найважнейшых культурных устаноў краіны стала для мяне, як я кажу, вяртаннем, але ў будучыню. У будучыню, таму што праз рэалізацыю новых ідэй, праектаў і падыходаў да мастацтва з'яўляецца магчымасць зрабіць крок наперад.

**«Калі б быў маладзейшы, з задавальненнем стаў бы кіраўніком малой сцэны Купалаўскага: яна дае нават больш магчымасцяў, чым пасада генеральнага дырэктара».**

***— Крок наперад, маецца на ўвазе, асабіста для вас?***

— Разлічваю, што мы зробім яго разам з калектывам, аб'яднаўшы адзін з найлепшых у беларускай тэатральнай прасторы творчы патэнцыял і адпаведны сённяшняму часу менеджмент. Стратэгія нашага тэатра — падтрымліваць развіццё нацыянальнай культуры і слова — акрэслена яшчэ сто гадоў таму. Я не маю права яе мяняць і перакананы, што ніхто не адважыцца на гэта ў будучым. Але метады і тэмпарытм яе рэалізацыі, канешне, могуць быць розныя, больш мабільныя і актыўныя.

***— Ваша імя, нават калі казаць пра дыпламатычную службу, часта гучыць менавіта ў звязцы з культурнымі ініцыятывамі. Ці было прасоўванне нацыянальнай культуры вашай свядомай місіяй?***

— Папулярызацыя сваёй краіны з'яўляецца адным з інструментаў сучаснай знешняй палітыкі. Працуючы паслом у Польшчы, Францыі, Іспаніі ды іншых краінах, я карыстаўся рознымі механізмамі — арганізацыяй эканамічных мерапрыемстваў, правядзеннем бізнес-форумаў, наладжваннем міжурадавых і міжпарламенцкіх кантактаў, але таксама намагаўся прэзентаваць дзяржаву праз яе культурнае багацце. Мы павінны паказваць свету нашу ўнікальнасць. На жаль, шмат французаў не ведаюць пра Беларусь — гэта франкацэнтрычная нацыя, засяроджаная больш на сваім унёску ў сусветную культуру. І хоць народамі былых савецкіх рэспублік яна асабліва не цікавіцца, нашы ініцыятывы мелі водгук, станоўча ўплывалі на ўспрыманне Беларусі і схілялі да больш глыбокага знаёмства з краінай.

***— Наколькі па вашым досведзе культурная дыпламатыя эфектыўная?***

— Зразумела, вынік дыпламатычнай працы перш за ўсё ацэньваецца па гандлёвым абароце і экспарце беларускай прадукцыі, але перадумовай для добрых эканамічных паказчыкаў з'яўляецца знаёмства з патэнцыйным партнёрам. Калі ў той ці іншай краіне не хапае інфармацыі пра нашу дзяржаву, варта звярнуцца і да культурнай дыпламатыі. Беларуская культура — частка еўрапейскай, яна мае глыбінныя карані. Вельмі важна, каб партнёры ў Еўропе зацікавіліся нашай краінай, гэта паказваць.

***— То-бок у стасунках паміж Беларуссю і Францыяй можна адсачыць рэальны вынік культурнай дыпламатыі?***

— Што мы называем рэальным вынікам? — гэта тое, колькі людзей прыйшло на нашы мерапрыемствы. Сотні тысяч французаў наведалі пастаноўкі Вялікага тэатра оперы і балета, Купалаўскага тэатра, Тэатра-студыі кінаакцёра, тэатральнага праекта «ТрыТФармаТ», Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, Беларускія музычныя сезоны, выстаўкі больш чым сотні нашых мастакоў і іншае, што распаўсюдзіла пазітыўную інфармацыю пра Беларусь. Ці гэта дрэнна для дзяржавы? Перакананы, што такі падыход слушны, прычым яго трымаюцца дыпламатычныя місіі па ўсім свеце.

***— За час вашай работы ў Францыі было арганізавана больш за дзвесце культурных мерапрыемстваў у больш чым пяцідзесяці французскіх гарадах — даволі шырока дзейнасць. Вы сціпла кажаце, што гэтым займаюцца ўсе дыпламатычныя місіі, але выглядае на тое, што на культуру вы рабілі стаўку.***

— Проста цікаўнасць да культурных падзей у грамадстве большая, таму яны і запамінаюцца лепш. Чалавек



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

не можа, як чапля, стаяць на адной назе. Мы стаялі на дзвюх: упершыню арганізавалі Беларуска-французскі бізнес-форум (пазней іх адбылося пяць) і Беларуска-французскія міжрэгіянальныя эканамічныя форумы, стварылі гандлёва-эканамічную камісію і падпісалі шэраг міжурадавых пагадненняў — усё гэта ў скарбонку адносін паміж нашымі краінамі. Але таксама мне было важна стварыць для дзеячаў культуры Беларусі дадатковую магчымасць паказаць сябе, напрыклад, у Парыжы — неафіцыйнай культурнай сталіцы свету, што прыцягвае людзей з розных куткоў планеты, дзе марыць выступіць шмат творчых людзей і рэцэнзіі якой могуць стаць шляхам да новага прызнання. Мы маем чым ганарыцца і што паказаць. Калі б на нашы спектаклі не прыходзілі поўныя залы, калі б у фінале людзі не ўставалі і не віталі нашых артыстаў апладысментамі, калі б не набываліся беларускія творы выяўленчага мастацтва, не было б пяцідзесяці гарадоў і двухсот праектаў.

***— І якія былі рэцэнзіі на выступленні беларускіх калектываў?***

— Перадусім мы аналізавалі водгукі наведвальнікаў. Напрыклад, у французаў не прынята ўставаць з апладысментамі, але я не адной-чы быў сведкам таго, як пасля завяршэння выступлення нашых артыстаў зала альбо яе частка ўставала. Я ўспамінаю, як Купалаўскі тэатр паказваў у Парыжы «Пана Тадэвуша». Арганізацыйна, фінансава і лагістычна гэта быў вельмі складаны праект, але высілкі апраўдаліся: усе семсот гледачоў — поўная зала — усталі, каб падзякаваць артыстам. Нягледзячы на хібы субцітраў — былі выкарыстаны пераклад яшчэ XIX стагоддзя, ад чаго нават французам было трохі складана яго зразумець — спектакль атрымаў высокую ацэнку. Рэцэнзіямі на наш балет мы можам ганарыцца, людзі нават пісалі нам лісты. Адной з самых яскравых падзей у Францыі для мяне стала выступленне «Песняроў». Яшчэ з Уладзімірам Мулявіным ансамбль іграў у Канах у 1976 годзе, а мы арганізавалі канцэрты ў Парыжы і Ліёне. Водгукі і эмоцыі публікі падчас выступлення застануцца са мной на ўсё жыццё. У такія моманты разумееш, што арганізацыя такіх мерапрыемстваў варта сіл і здароўя.

***— Як выбіралася, што паказаць французам, і ці была тут нейкая розніца з культурнай праграмай у Польшчы?***

— Мы пайшлі шляхам прэзентацыі розных кірункаў беларускага мастацтва: тэатральнага, музычнага, выяўленчага, манументальнага, харэаграфічнага, народнага і гэтак далей. Калі зразумелі, што ёсць запатрабаванне на музычныя вечары, якія мы ладзілі сумесна з узнагароджаным медалём Францыска Скарыны Георгіем Сасноўскім, зрабілі Беларускія музычныя сезоны. Калі зразумелі, што прыязджае ўжо не першы, не другі і нават не трэці спектакль, пачалі арганізоўваць Беларускія тэатральныя сезоны. Прэзентацыя беларускай культуры ў Польшчы абапіралася, з аднаго боку, на беларускую этнічную меншасць, якая жыве на ўсходзе краіны: менавіта дзякуючы падтрымцы беларусаў там адбываліся і адбываюцца дзясяткі культурных падзей. З іншага боку, палякі — ментальна блізкая славянская нацыя, таму публіка да канцэртаў з удзелам беларускіх калектываў падрыхтаваная. Для французаў нашы мерапрыемствы, наадварот, рабіліся адкрыццём невядомага белага абшару ў цэнтры Еўропы. Не так даўно ў Мінску я сустрэўся са знаёмай кіраўніцай адной французскай асацыяцыі ў справе аховы жывёл, сяброўкай Брыжыт Бардо — яна прызналася, што ў захапленні ад першага візіту ў Беларусь, і шкадуе, што ў Францыі так мала інфармацыі пра нашу краіну.

***— Вы вярнуліся ў Мінск з культурнай сталіцы свету. Што, як вам падаецца, беларускай культуры добра было б пераняць?***

— Калі казаць пра метады кіравання і менеджменту ў сферы культуры, некаторыя формы маглі б нам спатрэбіцца. Некалькі гадоў таму мы на адмысловай нарадзе абмяркоўвалі ўвядзенне ў Беларусі сістэмы электронных білетаў. Я памятаю, як цяжка гэта пытанне вырашалася і наколькі нашы ўстановы культуры былі не гатовыя да таго, што сёння з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця. Карысных практык у Францыі дастаткова, і мы маглі б імі скарыстацца, але калі казаць у цэлым пра культуру, то для свету мы каштоўныя менавіта сваёй унікальнасцю. Мы павінны не пераймаць, а захоўваць і паказваць сваё. Варта ганарыцца і людзьмі, якія нарадзіліся на беларускай зямлі, а ўнёсак зрабілі ў культуру іншых краін, у прыватнасці Францыі. Прывяду адзін прыклад звычайнага дня ў Парыжы: раніцай у горнай школе, дзе вучыўся Ігнат Дамейка, мне далі магчымасць дакрануцца да яго асабістых лістоў і дакументаў, у гэты самы дзень прайшоў аўкцыён работ мастака Парыжскай школы Пінхуса Крэменя, што нарадзіўся на Лідчыне, і адкрылася выстаўка «Гіём Апалінэр і яго сябры» — маці Апалінэра паходзіла з Навагрудчыны, а яго сябрамі былі Марк Шагал і Хаім Суцін. Тут паўсюль можна знайсці месцы, звязаныя з нашай краінай, Парыж — гэта Агінскі, Орда, Міцкевіч, Ваньковіч, Радзівілы. Так, не ўсе асобы, што паходзяць з Беларусі, выклікаюць з ёй асацыяцыі, таму адна з місій дзяржавы заключаецца ў тым, каб праз дыпламатычныя службы гэтыя асацыяцыі ў грамадскасці ствараць і замацоўваць.

**«Развіццё культуры таксама залежыць ад саспеласці грамадства і ў прыватнасці людзей, якія фарміруюць яе ідэалагічную лінію».**

***— У гэтай дыскусіі можа прагучаць довад, што наша тэрыторыя не дала гэтым людзям развіцца і стаць сусветна вядомымі, дык якое мы маем права называць іх сваімі.***

— Ці сапраўды трэба дзяліць? Праз постаці, якія нарадзіліся на Беларусі і праславіліся ў іншай краіне, мы, наадварот, павінны шукаць тое, што аб'ядноўвае, тут няма нічога дрэннага. Я вёў перапіску з адным каталіцкім храмам у Францыі, дзе было пазначана, што Шагал нарадзіўся ў маленькай вёсцы Віцебск Расійскай імперыі. Я напісаў, што ўсё ж такі Віцебск — не вёска, а горад, на той момант там жыло каля шасцідзесяці тысяч чалавек, а наконт паходжання варта ўказваць, як робіць усё больш і больш выданняў, што месцам нараджэння мастака з'яўляецца Беларусь.

# лёгка адрознівае ад падробкі»

***— Як місію прасоўвання беларускай культуры вы працягнеце ў Купалаўскім тэатры? Ці пашырыце межы, якія тэатр ужо займае?***

— Думаю, абмежаванняў, агароджаў у сферы культуры ўвогуле не павінна з'яўляцца. Тым больш у тэатральным мастацтве, якое мае быць месцам для эксперыментаў і новых падыходаў, здольных прымусіць гледача думаць, аналізаваць, з розных бакоў паглядзець на жыццёвыя і грамадскія сітуацыі. Генеральны дырэктар павінен забяспечваць фінансавую стабільнасць тэатра. Купалаўскі знаходзіцца ў добрым эканамічным стане, але ў справе рэалізацыі новых праектаў мы будзем разлічваць на падтрымку спонсараў, мецэнатаў і рэкламадаўцаў. Прыватныя партнёры дапамогуць нам выйсці за сцены асноўнага будынка — я кажу пра пашырэнне тэатральнай прасторы, куды глядач без аніякага адміністрацыйнага рэсурсу будзе зацікаўлены прыйсці па нешта новае і нестандартнае.

***— На што канкрэтна Купалаўскаму патрэбны дадатковыя грошы ад прыватных партнёраў?***

— Лічу, што першы прафесійны тэатр Беларусі павінен мець больш шырокую функцыю, чым рэгулярная пастаноўка спектакляў. Мы маем намер, пры падтрымцы Міністэрства культуры, завяршыць капітальны рамонт малой сцэны на вуліцы Энгельса. Тут не спатрэбяцца вялікія грошы, бо мы зробім аскетычную, але шматфункцыянальную прастору для эксперыментаў. Каб паглядзець на прыгожыя жырандолі — калі ласка на галоўную сцэну, а новая арт-пляцоўка тым часам умесціць у сабе галерэю для выяўленчага мастацтва (думаю, яшчэ адна галерэя ў цэнтры Мінска будзе важная для нашых мастакоў і запатрабаваная сярод аматараў мастацтва) і Дзіцячую тэатральную студыю. Скажу шчыра, калі б толькі пачынаў свой шлях у культуры, з задавальненнем стаў бы кіраўніком малой сцэны Купалаўскага: яна можа даць нават больш магчымасцяў, чым пасада генеральнага дырэктара. Натуральна, сродкі патрэбны і на новыя спектаклі на галоўнай і камернай сцэнах. Абмяркоўваем таксама выданне ўласнага часопіса.

***— А дзіцячая тэатральная студыя — гэта новая ідэя?***

— Так, найбліжэйшым часам мы плануем падпісаць дамову на апрацоўку канцэпцыі. Мы ўвогуле зацікаўлены ў новых ідэях: мы адчынілі ўсе дзверы і вокны — калі ласка, прыходзьце да нас са сваімі праектамі. Таксама для нас будзе важная, асабліва ў сувязі са стагоддзем Купалаўскага, гастрольная дзейнасць. Пасля завяршэння рэстаўрацыі і пераезду ў новы будынак тэатр, можа, не так шмат гастраляваў па Беларусі, але па размовах з артыстамі я бачу, што яны ў гэтым зацікаўлены, таму ўжо з верасня будзем арганізоўваць паездкі па краіне і за мяжу. Я перакананы, нам гэта пад сілу.

***— Ці ёсць нешта, што ў тэатры для вас будзе непрымальна?***

— Усё гэта ўжо акрэслена заканадаўствам, ставіць дадатковыя бар'еры няправільна, трэба іх, наадварот, здымаць і ствараць больш магчымасцяў для творчай рэалізацыі калектыву. Гляджу на мастацтва максімальна шырока.

**«У французаў не прынята ўставаць з апладысментамі, але я не аднойчы быў сведкам таго, як пасля завяршэння выступлення нашых артыстаў зала альбо яе частка ўставала».**

***— А ці ёсць нейкія абмежаванні з боку Міністэрства культуры?***

— Няма ніякіх. Дзяржава ўклала значныя сродкі, каб аднавіць гістарычны будынак Купалаўскага — сёння мы маем найлепшую і самую тэхналагічную сцэну ў краіне. Да таго ж яна фінансуе штодзённую дзейнасць тэатра і новыя пастаноўкі.

***— Падчас вашай працы міністрам культуры была ўведзена сістэма фінансавання кінематографа праз рэспубліканскі конкурс кінапраектаў. Яна, на ваш погляд, працуе?***

— Наколькі я ведаю, гэта сістэма зазнала шэраг змен. Калі мы кажам пра кінасферу, трэба перш за ўсё зразумець, для каго мы хочам здымаць кіно. Калі на экспарт — уключаючы стандартныя бізнес-механізмы, а калі для сябе, варта ўсведамляць, што праз свае кінатэатры і тэлебачанне мы не ўстане вярнуць хаця б адчувальную частку бюджэту фільма. Лічу, прыярытэтным для нас з'яўляецца кіно для сябе — для Беларусі, беларусаў і пра Беларусь і беларусаў. Наступнае пытанне — хто яго прафінансуе? У еўрапейскіх краінах адным з галоўных заказчыкаў з'яўляецца тэлебачанне, але ў нас сёння гэта немагчыма, значыць, адказнай за фінансаванне кінасферы становіцца дзяржава. Дадатковым інструментарыем, калі ёсць падатковыя льготы, можа стаць дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Далей для кінагульцоў неабходна стварыць канкурэнтнае асяроддзе, у якім яны будуць спаборнічаць, у тым ліку з «Беларусьфільмам», за дзяржаўную падтрымку. Калі здымацца будзе толькі Нацыянальная кінастудыя, якія б там таленавітыя рэжысёры ні працавалі, нічога не атрымаецца, мы гэта ўжо прайшлі праз дзесяцігоддзі ўласнага досведу. Калі на базе «Беларусьфільма» плануецца ствараць прадзюсарска-вытворчую кампанію — перакананы, гэта дасць толькі кароткатэрміновы вынік. «Беларусьфільм» можа даваць паслугі: калі ласка, усіх запрашаем, хай тэлеканалы і прадзюсары з іншых краін прыходзяць здымаць кіно, бо ў нас, напрыклад, суперсучаснае абсталяванне, найлепшае падаткаабкладанне, павільёны працуюць не толькі ўлетку, але і зімой, у Мінску няма затораў і гэтак далей. І нарэшце, хто павінен каардынаваць працэсы ў беларускім кіно? Афіляваная дзяржавай структура — нацыянальны кінаінстытут альбо фонд, якая разглядала б заяўкі, фарміравала конкурсныя камісіі і прымала рашэнні. Прыбыткі пералічваюцца ў інстытут, а ён, калі фільм паглядзела, напрыклад, сто тысяч гледачоў, вяртае прадзюсарам грошы і кажа: «Малайцы, здымайце яшчэ». Непасрэдна дзяржава яго не фінансуе, ён залежыць ад эфектыўнасці кіравання. Гэта ідэальная схема? Так, але яна рэальная, што даказана прыкладамі многіх краін.

***— Наколькі, як вам здаецца, у нашай краіне ўвогуле створаны ўмовы для развіцця новых формаў і праектаў у культуры?***

— Гэта даволі складанае пытанне, бо звязана ў тым ліку з развіццём эканомікі. Думаю, паступовы рост эканамічнага і бізнес-патэнцыялу створыць дадатковыя магчымасці для сферы культуры. Што датычыцца заканадаўчых інструментаў, не бачу прынцыповых перашкод, якія заміналі б рэалізацыі ідэй і праектаў. Развіццё культуры таксама залежыць ад саспеласці грамадства і ў прыватнасці людзей, якія фарміруюць яе ідэалагічную лінію. Неяк з Мікалаем Пінігіным мы па-сяброўску дыскутавалі наконт новых пастановак Купалаўскага, і пра адзін з нашых класічных твораў ён сказаў, што той страціў актуальнасць, а я адказаў, што таленавіты рэжысёр заўсёды зможа знайсці новае прачытанне. Усё мяняецца, мы рэфармуемся, рэфармуецца грамадства — сёння глядач лёгка адрознівае сапраўднае ад падробкі і не кожны прадукт гатовы «купіць». Я перакананы, працэс будзе ісці: тое, што дзесяць гадоў таму здавалася немагчымым, цяпер не выклікае здзіўлення.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# «Калі я бачу чыесьці слёзы, перастаю хвалявацца...»

## «Запрашэнне» на паэтычны дэбют Ніны Лістоты

**«Ты будзь маёй музыкай ночы, / Пялёсткамі ружы ў далонях, / І пульсам гарачым у скронях, / І сонцам, што кінулі вочы», — гэтыя радкі на прэзентацыі кнігі «Запрашэнне» маладой паэткі і журналіста «Звязды» Ніны Лістоты вывучылі на памяць усе прысутныя. 24 чэрвеня ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча яны загучалі ў выкананні гурта Helious, а іх аўтарка прадставіла свой дэбютны зборнік вершаў.**



Паэтка Ніна Лістота і журналіст Ніна Шчарбачэвіч.

Атрымалася шчырая і эмацыянальная гутарка са старымі сябрамі, гэткая размова на кухні, дзе адбываецца самае праніклівае і патаемнае. Ніна Лістота і сама сказала, што ў яе жыцці самыя важныя моманты часта перажываюцца акурат на кухні. На імпрэзе пад акампанемент фано, на якім іграла Настасся Мінкоўская,



Фота Андрэя САЗОНАВА.

і пад саксафон Алега Воранава былі прачытаны вершы пра каханне і прадстаўлены блок паэзіі пра тое, што выйсце ёсць заўжды.

Ніна Лістота — гэта творчы псеўданім, пад якім аўтара кнігі ведаюць у тым ліку ў сацыяльных сетках. Многім досыць складана суаднесці гэты вобраз з асобай журналіста Ніны Шчарбачэвіч, некаторыя дагэтуль думаюць, што гэта два розныя чалавекі.

«Я бачу пэўную місію ў тым, каб натхняць іншых людзей жыць сваімі талентамі, нават калі яны недзе прыхаваныя, — гэта патрэбна кожнаму чалавеку. І калі пасля прэзентацыі мне кажуць, што таксама вырашылі напісаць ці зрабіць нешта цікавае, гэта становіцца для мяне найлепшым кампліментам», — прызнаецца паэтка.

У зборнік «Запрашэнне» ўвайшлі вершы розных гадоў творчасці. «Я шмат разоў змяняла напаўненне кнігі, але для мяне было прынцыпова, каб сюды ўвайшлі некаторыя раннія рэчы, няхай яны і не самыя дасканалыя і патыхаюць юнацкім максімалізмам».

На прэзентацыі былі смех (у некаторыя моманты аўтарка сама адкрыта рагатала), слёзы (некаторыя нават выходзілі з пакоя, каб схаваць рэакцыю) і абнадзейлівыя радкі на завяршэнне. «Паглядзім на сузор'е надзей / І паслухаем месяца джаз. / Хтосьці мусіць быць лепшым з людзей. / Можа, неба ставіць на нас?..»

**Ірына СІДАРОК.**

# «Жыць — даганяць прывід...»

**У «Кнігазборы» выйшаў шосты том «Дзённікаў і запісаў» народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна.**

Перад чытачом разгортваюцца падзеі 1992—1993 гадоў, у якіх Рыгор Барадулін паўстае нераўнадушным творцам і чалавекам напружанага грамадскага жыцця. «...Новы час — і новы статус краіны прынёс і пэўныя цяжкасці...» — піша на самым пачатку прадмовы ўкладальніца Наталля Давыдзенка. У гэтыя гады пабачылі свет зборнік новых вершаў Барадуліна «Міласэрнасць плахі» (1992), кніга «Трэба дома бываць часцей...: Выбраныя старонкі лірыкі» (1993) і «Беларусь мяне збелярушвае» (1993) — зборнік вершаў 77 паэтаў свету пра Беларусь у перакладзе Рыгора Барадуліна. У гэты час паэт стварае вялікія і, несумненна, высокай узнёсласці цыклы вершаў — «Следам Эклезіяста», «Следам Прыпавесцяў Саламонавых», «Следам Апостала Паўла» і «Стане Віфлеемам сэрца...». Рыгор Барадулін таксама перакладае п'есы Мальера і Карла Гоцці для Купалаўскага тэатра. Піша сцэнарыі некалькіх запамінальных дакументальных фільмаў: «Белая вежа — цемра густая» (пра паляванні ў Белавежскай пушчы кіроўчых асоб розных часоў), «Ушацкія вяселлі», «Ой, ляцела шэра перапёлачка...» (пра родзічку Марыю Рыгораўну і народныя песні ў яе выкананні), «Ля берага човен чакае...» (пра Уладзіміра Дубоўку), «У чым жа існасць існавання», «Дзівосная Дзвіна», «Зялёны ўспамін» (пра Налібоцкую пушчу).




Напружаны творчы працэс і здзейсненыя мастацкія праекты не дужа мянялі песімістычны, цяжкі настрой. Як адбітак таго, што адбывалася вакол, як галоўны персанаж ён — у шостым томе... «Адно што засталося ў мяне — сон, куды хоць на ноч уцякаю ад усяго жахлівага й бяспрасветнага. Але ж у запасе вечны сон, а цяпер трэба прачнацца. Жыць — даганяць прывід, пакуль сам не зробішся прывідам. Калі сам апынаешся ў пастцы нястачы, пачынаеш разумець болей, колькі свайго жыцця паклала мама, каб зрабіць цябе чалавекам. Рабіла ўсё гэтак, што сын не адчуваў горычы й адчаю мамы. Такое адчуванне, што мяне пасадзілі, як у казках і песнях, у бочку, бочку забілі й пусцілі з гары. Грукат і цемра. І грымакі. А калі бочка спыніцца, ні яна, ні я не ведаем. Скачам» (20 кастрычніка 1993 года).

У дзённікавых запісах Рыгора Іванавіча — шмат згадак пра народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, з якім Барадулін сябраваў праз многія гады жыцця, пра іншых пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, акцёраў. Літаральна кожная старонка, насычаная эмацыянальнасцю і шчырасцю, успрымаецца і як важкі дакумент таго далёкага і разам з тым надзвычай блізкага часу. У памяці чытацкай і тое, што творчая спадчына народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна пабачыла свет усяго ў чатырох тамах, а «Дзённікі і запісы» ўжо маюць шосты. Мо з часам выйдзе паўнакроўны збор твораў адной з самых адметных асоб у нацыянальнай літаратуры Беларусі?..

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 10 июля 2019 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 25 % после пятых несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости (лот № 1), принадлежащих Открытому акционерному обществу «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко» на праве собственности**

Состав лота № 1

**Корпус опытно-промышленного производства сорбентов, инв. № 350/С-107542.** Назначение: здание неустановленного назначения. Трехэтажное кирпичное здание, год постройки – 1993. Общая площадь – 2311,3 кв. м. Составные части и принадлежности: крыльца

**Автостоянка № 2, инв. № 350/С-107541.** Назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. Открытая площадка, год постройки 2003. Площадь 1812 кв. м. Составные части и принадлежности: площадка, ворота, ворота. **Часть сооружения – 520,0 кв. м сдана в аренду сроком по 31.07.2023 г.**

**Зарядная станция, инв. № 350/С-56078.** Назначение: здание специализированное иного назначения. Одноэтажное кирпичное здание, год постройки не определен. Общая площадь 172,0 кв. м. **Часть здания – 118,0 кв. м, сдана в аренду сроком по 31.07.2023 г.**

Местонахождение объектов: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150

**Земельный участок** для обслуживания объектов недвижимости на праве постоянного пользования площадью **0,4858 га** с кадастровым номером 340100000005005823. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Помещение транспортного назначения, инв. № 350/D-182492.** Назначение: помещение транспортного назначения. Нежилое изолированное помещение расположено в пристройках к двухэтажному кирпичному зданию 1950 года постройки. Общая площадь 294,9 кв. м. **Часть помещения – 134,0 кв. м, сдана в аренду сроком по 31.07.2023 г.**

Местонахождение объекта: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150-1

**Земельный участок** для обслуживания здания, в котором расположено изолированное помещение, на праве постоянного пользования площадью **8,4705 га** с кадастровым номером 340100000005001181. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Начальная цена лота № 1 – 432 214,61 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
**Задаток по лоту № 1 – 43 221,46 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 9 июля 2019 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **10 июля 2019 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

